Пралетары усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

№ 20 (3528) Субота, 25 студзеня 1930 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63.
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781.

МАСКВА. Наркамфін СССР тав. Бруханаў у гутарцы заявіў, што, ня гледзячы на радпістоў ад рабочых і сялян, пазыку капектывізацыі зараз выпускаць нямэтазгодна. Задачаю сёньняшняга дня зьяўляецца заканчэньне работ па разьмеркаваньні 3-е пазыкі індустрыялізацыі, з поўным ахопам падпіскаю ўсяго сялянства і новых рабочых, якія ўліваюцца ў вытворчасьць.

100 студэнцкіх брыгад выехалі у вёсны

У зьвязку з канікуламі каля 100 студэнцкіх брыгад вышэйшых навучальных устаноў і тэхнікумаў БССР выехалі ў раёны для ўдзелу ў падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі. Брыгады прабудуць на месцах 2 тыдні і будуць выконваць заданьні савецкіх і партыйных арганізацый. Адначасова з гэтым студэнцкім брыгадам дана заданьне вербаваць рабочых, батракоў, калгасную і бяднацкую моладзь у тэхнікумы і ВНУ

УСЕ СІЛЫ--НА СТВАРЭНЬНЕ НАСЕНФОНДАЎ У КАЛГАСАХ

Арганізацыі праяўляюць злачынную маруднасьць і нядбайнасьць: заданьне выканана толькі на 10%

Мацней ударым па кулаку, які агітуе за разбазарваньне насенных фондаў

ДАБІЦЦА ПАВЯЛІЧЭНЬНЯ ПАСЕЎНАЙ ПЛОШЧЫ Ў КАЛГАСАХ, ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ІХ ПОЎНАСЬЦЮ НАСЕНЬНЕМ

Усім АК КП(б)Б

Стварэньне насенных фондаў у калгасах праходзіць злачынна невыстарчальным тэмпам. Дадзены для ўтварэньня гэтых фондаў тэрмін скончыўся 15 студзеня, а заданьні ня выкананы, у зьвязку з чым ёсьць пагроза зрыву веснавой пасеўнай кампаніі ў калгасах. Выходзячы з гэтага, Сакратарыят ЦК КП(б)Б прапануе:

1. Калгасцэнтру і Паляводсаюзу праз пяць дзён далажыць ЦК падрабязныя лічбы становішча стварэньня семянных фондаў у калгасах, абавязаўшы фракцыі гэтых саюзаў прыняць усе меры да абавязковага ў бліжэйшы час стварэньня насенных фондаў у калгасах, у той колькасьці, якая патрэбна для поўнага забесьпячэньня ўсяго яравога кліну ў калгасах.

2. Прапанаваць акругкомам тэрмінова праверыць ход гэтай працы, прыняўшы ўсе меры да стварэньня насенных фондаў, прымацаваўшы да кожнага калгасу таварышоў, усклаўшы на іх адказнасьць сумесна з праўленьнем калгасу за своечасовае выкананьне заданьняў па стварэньні насенных фондаў.

Да 5 лютага далажыць спэцыяльным лістом ЦК аб выкананьні гэтай дырэктывы. Па таму, як будзе выканана гэта заданьне, ЦК будзе судзіць аб рабоце арганізацыі.

ЦК КП(б)Б.

Да 1-га лютага выканаць заданьне

Своечасовае стварэньне і абагуленьне насенных фондаў у калгасах—гэта ў даны момант—адно з самых важных мерапрыемстваў у нашай падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Кулакі, адчуваючы, што суцэльная калектывізацыя сельскай гаспадаркі, якая стыхійна пашыраецца і паглыбляецца, нясе ім няўхільную пагібель, усякім спосабам адгаворваюць калгасьнікаў ад здачы свайго насеньня ў абагуленыя калгасныя насенныя фонды. Кулаком хацелася-б бачыць калгасныя сьвірны пустымі і калгасныя палі незасеянымі.

Але трэба сказаць, што, ня гледзячы на ўсю важнасьць і адказнасьць засыпкі насенных фондаў у калгасах, ня гледзячы на тое, што гэта важнасьць ня раз падкрэслівалася ў катэгарычных дырэктывах партыі і ўраду, мы тут наглядаем, калі не прарыў, дык спазьненьне і маруднасьць, якія могуць прывесьці да прарыву. Паказам гэта на фактах.

У Наркамземе ведаюць толькі, што з складаньнем насенных фондаў справа абстаіць кепска, вельмі кепска, а больш-менш канкрэтнымі лічбовымі весткамі самі не распалагаюць. У Наркамземе нам маглі толькі паведаміць, што ў Бабруйскай акрузе на 10-га студзеня ў калгасах абагулена **толькі 5.000 тон** (па пляне патрэбна выдзеліць 31.000 тон) і ў Гомельскай акрузе абагулена і таго менш—**3.200 тон.** Таксама дрэнна ідзе стварэньне насенных фондаў па лініі КСУ — у Бабруйскай акрузе сабрана 1.800 тон, замест патрэбных па пляне 9.100 тон і ў Гомельскай акрузе з 10.000 тон, вызначаных па пляне, сабрана толькі 207 тон, іншыя акругі **ў тым ліку Менская** вестак аб стварэньні насенных фондаў яшчэ не прадставілі.

Магілеўскі і Гомельскі калгассаюзы паведамляюць, што **пакуль што** яны яшчэ вестак аб выдзяленьні насенных фондаў у калгасах не атрымалі. А Віцебскі і Мазырскі калгассаюзы замест адказу па сутнасьці паведамляюць толькі прозьвішчы тых таварышоў, на якіх яны ўскладалі адказнасьць за абагуленьне насенных фондаў.

Такім чынам на ўрыўкавых вестках, што ў нас ёсьць, на 10-га студзеня абагуленьне насенных фондаў у калгасах па збожжавых культурах не перавышае 10 проц., а па бульбе—15-16 проц., за выключэньнем хіба Мазырскай і Магілеўскай акруг, дзе гэты процант крыху вышэйшы. Гэта зусім мізэрныя лічбы.

Ёсьць весткі, што частка сялян, якія ўступілі ў калгасы, пад уплывам кулацкай агітацыі, ўхіляюцца ад перадачы свайго насеньня ў абагуленыя фонды, замест гэтага прадаюць, разбазарваюць насеньне. Трэба будзе паставіць пытаньне аб выключэньні такіх сялян са складу калгасу. А ў адносінах да тых калгасаў, якія ня выконваюць дырэктывы аб выдзяленьні насенных фондаў, прыдзецца ўжываць некаторыя меры ўзьдзейваньня, як напрыклад, пазбаўленьне або скарачэньне ім крэдытаў.

З поводу створанага ў нас пагражаючага становішча з абагуленьнем насенных фондаў у калгасах, у Менску атрымана тэлеграма ад ЦК УсеКП(б), у якой гаворыцца наступнае:

Паводле даных Саюзнага Наркамзему выдзяленьне насенных фондаў у калгасах Беларусі праводзіцца злачынна-марудна. Заданьне скончыць стварэньне насенных фондаў да 15-га студзеня выканана ня больш, чым на 10 проц. ЦК УсеКП(б) прапануе неадкладна скансцэнтраваць усе сілы на вырашэньне гэтай задачы. Ніякай дадатковай насеннай дапамогі, акрамя ўжо вызначанай для калгасаў у недародных раёнах (Беларусь да гэтых раёнаў не адносіцца), **ня будзе.**

ЦК УсеКП(б) прапануе прымацаваць да кожнага калгасу асобных працаўнікоў, якія адначасова з праўленьнямі калгасаў адказвалі-б за арганізацыю насенных фондаў.

Тэлеграма ЦК УсеКП(б) заканчваецца словамі: **«дабецеся да 1-га лютага выкананьня заданьня».**

Гэта тэлеграма ЦК УсеКП(б) катэгарычна абавязвае нас пасьпяшыцца з выдзяленьнем насенных фондаў у калгасах. Трэба неадкладна, выявіўшы ўсіх злачынных маруднікаў, прыцягнуўшы іх да адказнасьці, агульнымі сіламі ўзяцца за работу, ніякіх праволачак і адцяжак тут не павінна быць.

Трэба таксама самым рашучым чынам даць адпор кулацкай агітацыі аб тым, што ня трэба асабліва клапаціцца аб стварэньні насенных фондаў. Трэба ўкараніць у сьвядомасьць сялян, якія ўступілі ў калгасы, што разбазарваньне гэтага насеньня зьяўляецца злачынствам, якое можа сарваць калектывізацыю сельскае гаспадаркі.

Л. Н—даў.

ПЕРАД НАЙВЯЛІКШЫМ ЭКЗАМЭНАМ

МАСКВА. 19-га студзеня на праводзінах маскоўскіх рабочых, якія паехалі ў калгасы, з дакладам выступіў Наркамзем СССР тав. Якаўлеў.

Пастаўленыя ЦК партыі і Саўнаркомам задачы пашырыць вясною пасеўную плошчу на 11 проц., у прыватнасьці павялічыць клін яравое пшаніцы на 20 проц.,—заявіў тав. Якаўлеў,—трэба разглядаць, як мінімум неабходнага, мажлівага.

Вясною калгасны рух будзе трымаць вялізарны экзамэн перад рабочай клясай і сялянствам нашага краю, перад абліччам усяго сьвету. Ён будзе правярацца ня толькі на падставе таго, колькі мільёнаў гаспадарак аб'ядналася ў калгасы, але і тым, ці сапраўды сяляне, якія аб'ядналіся ў калектывы, змаглі павялічыць пасеўную плошчу ў значнай меры, апрацаваць яе лепш у параўнаньні з тым, што яны засявалі, вядучы індывідуальныя гаспадаркі. Не памочнік нам, а вораг земляўпарадкавацель, які не разумее, што ўся яго навука павінна гэтаю зімою служыць цалкам калгаснай справе.

Другая задача—арганізацыя машыні цягавае сілы. Трэба з аднаго боку арганізаваць максымальнае выкарыстоўваньне трактароў і буйных машын, каб ні адна гадзіна дарэмна не прапала, а з другога—выкарыстаць коні і ўвесь наяўны інвэнтар, як бы ён ня быў дрэнны, у параўнаньні з трактарамі.

Дзяржава ў гэтым годзе выдаткавала $2^1/_4$ мільёна цэнт. насеньня для дапамогі калгасам у недародных раёнах. Больш гэтага даць немагчыма. Астатнія 33 мільёны цэнтр., калгасы павінны ўзяць з сваіх насенных рэсурсаў. У бліжэйшыя тылні па тым, у якой меры будзе выканана заданьне па зборы калгасных насенных фондаў, прыдзецца меркаваць аб працы кожнага калгасу, кожнага зямельнага органу. Саюзны Наркамзем будзе самым суровым чынам сачыць за ходам мабілізацыі насенных фондаў у кожнай акрузе і тых кіраўнікоў зямельнае і калгаснае працы, якія гэтага заданьня ня выканаюць, будзем бязьлітасна здымаць з пастоў, прыцягваць да судовай адказнасьці.

ЦК партыі з прычыны асаблівае важнасьці гэтае справы запрапанаваў непасрэдна кожнаму райкому партыі прымацаваць асобу да кожнага калгасу, якая-б адказвала побач з праўленьнем калгасу за канчатковае вылучэньне ўсіх неабходных насенных фондаў да 10-га лютага. ЦК партыі папярэдзіў усе партыйныя арганізацыі, што па тым, як партарганізацыя выканае гэта баявое заданьне да 10-га лютага, ён будзе судзіць аб працы.

Зараз нам патрэбен плян таго, што людзі, машыны павінны будуць рабіць вясною. Вытворчыя пляны трэба рыхтаваць ў красавіку, а ў лютым. Падлічыць, сабраць насеньне, мабілізаваць, вывіць, колькі сродкаў маецца ў распараджэньні калгасаў, якая маецца цягавая сіла, забясьпечыць правільны нагляд за інвэнтаром і жывёлаю, вызначыць такі спосаб аплаты працы, які сапраўды-б за поўнай ўзьняць працоўнай насьць працы калгасу, вызначыць, колькі гэктараў будзе засеена, чым будзе засеены кожны вучастак—усё гэта ў цэлым павінна даць вытворчы плян.

Каб пры вырашэньні ўсіх гэтых практычных пытаньняў вялізарнае важнасьці ні на адзін момант ня зьбіцца са шляху, вам патрэбна кожнае практычнае пытаньне асьвятліць з пункту погляду палітыкі партыі, умець разглядзець за тэхнікаю справы самае важнае яго значэньне ў тэй вялізарнай клясавай барацьбе бяднацкіх і серадняцкіх мас з кулаком, якая разгортваецца ў раёнах суцэльнае калектывізацыі.

Што робяць сяляне-калгасьнікі з кулаком у раёне суцэльнае калектывізацыі? Яго пазбаўляюць зямлі, або адводзяць яму вучастак горшае зямлі пазакалгаснага масыву. Канфіскуюць у яго ўсе сродкі вытворчасьці, або тую часьць сродкаў вытворчасьці, якая служыла сродкам да закабаленьня. Канфіскуюць у яго гаспадарчыя будынкі, залічваючы ў непадзельны капітал калгасу, ставячы ў вялізарныя кулацкія хлявы грамадзкія коні. Пазбаўляюць яго магчымасьці браць у аренду зямлю, бо ўся зямля, якая можа быць выкарыстана, патрэбна самім калгасам. Пазбаўляюць яго магчымасьці ў калектыве стаць роўнапраўным членам новае грамадзкае гаспадаркі. Пры чым у радзе выпадкаў кулацкія дзеці падымаюцца супроць бацькоў, разлагаючы, разьбіваючы кулацкую сям'ю, тым самым яшчэ больш ізалюючы кулака. У радзе выпадкаў і гэтага бывае мала.

Азьвярэлыя кулакі, пазбаўленыя самых устоеў свайго існаваньня, ідуць на забойствы і падпалы. У такіх выпадках выступае суд, які бязьлітасна расправяецца з кулацкімі тэрарыстамі.

У адносінах раёнаў суцэльнае калектывізацыі рад дэлегатаў паставіў пытаньне, каб кулакоў, найбольш нянужнымі, гатовых у любы момант на падпалы і зьдзекі, вясяліць зусім з раёнаў суцэльнае калектывізацыі. Відавочна, прыдзецца пайсьці і на гэтую меру, даўшы такім кулаком магчымасьць у далёкіх раёнах Сібіры і Паўночы, на новым месцы, прыстасаваць сваю працу, расчышчаючы лясныя вучасткі, працуючы па загатоўцы лесу і г. д. Каб практычна вырашыць усе гэтыя пытаньні, вам неабходна ўмець абаперціся на арганізацыю і пад'ём усяе асноўнае масы калгасьнікаў, у першую чаргу беднаты. Трэба кожны дзень дапамагаць тым элемэнтам калгасаў, якія будуць змагацца з рэшткамі і перажыткамі індывідуалістычнае дробна-ўласьніцкае псыхалёгіі.

Нарэшце, з усімі гэтымі пытаньнямі непарыўна зьвязана пытаньне аб рашучай перабудове працы саветаў у вёсцы. Трэба мець на ўвазе, што ў раёнах суцэльнае калектывізацыі роля саветаў, як органаў пралетарскае дыктатуры, павінна быць узмоцнена, праца арганізацыі беднаты калгасьнікаў вакол саветаў павінна разгарнуцца з вялізарнейшай сілай—гэта адна з важнейшых умоў посьпеху тае новае рашаючае формы змычкі рабочае клясы з сялянствам, якую стварае калектывізацыя.

ЧАКАЮЦЬ ПАКАЗАНЬНЯЎ ЗЬВЕРХУ

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Падрыхтоўка да сяўбы ў акрузе праходзіць зусім слаба. Кожны дзень з раёнаў паступаюць весткі аб нядбайных адносінах сельсаветаў у падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі.

У раёнах пляны пасеўнай кампаніі яшчэ ня складзены і не даведзены да калгасаў і вёсак. Ачыстка насеньня ідзе недапушчальна марудна, дагэтуль ачышчана толькі 8 проц. насеньня, некаторыя акруговыя ўстановы, як Дняпрасаюз, Саюзхлеб, малочна-жывёлагадоўчы саюз, **ня прымаюць ніякага ўдзелу ў падрыхтоўцы да сяўбы і чакаюць паказаньняў зьверху.**

ТЭЛЕГРАМА НАРКАМЗЕМАМ САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІК

Зараз ёсьць усе даныя меркаваць, што пасеўная плошча калгасаў значна перавысіць 30 мільёнаў гэктараў, вызначаных урадам. Тым вастрэй паўстае пытаньне аб насеньні. Яшчэ раз натагарычна патрабую дабіцца поўнага забесьпячэньня фактычна аграмаджанае да вясны плошчы насеньнем саміх калгасаў. Паводле ходу мабілізацыі аграмаджаных насенных фондаў Саюзны Наркамзем будзе меркаваць аб вашай рабоце.

Нам. НКЗ СССР—ГРЫНЬКО.

Аграпаход войск БВА

Упічваючы вялікае палітычнае значэньне веснавой пасеўнай кампаніі, рэвалюцыйны вайсковы савет Беларускай вайсковай акругі пастанавіў правесьці ў перыяд паміж 1 і 10 студзеня трохдзённы аграпаход у вёску ўсіх часьцей Беларускай вайсковай акругі.

Часьці прымуць удзел у ачыстцы насеньня, у рамонце с.-г. машын і прылад, пабудове і рамонце дварбў для жывёлы, у рабоце кузьняў і рамонтных майстэрань у калгасах і саўгасах.

Чырвонаармейцы дапамогуць мясцовым арганізацыям давесьці пляны сяўбы да калгасаў, арганізацыйна аформіць новыя калгасы, правесьці месячнік жывёлагадоўлі, разгарнуць конна-машынныя станцыі і г. д.

„Зьвязда" прыняла выклік „Сельско-Хозяйственной газеты"

«Сельско-хозяйственная газета» зьвярнулася да «Зьвязды» з заклікам арганізаваць праверку работы Віцебскага заводу «Чырвоны Мэталісты» і Гомельскага «Рухавік Рэвалюцыі», якія вырабляюць запасныя часьці да машын.

«Зьвязда выклік «Сельско-Хозяйственной газэты» прымае. У Віцебск камандыраваны спэцыяльны карэспандэнт, якому даручана высьветліць прычыны невыкананьня заводам «Чырвоны Мэталісты» заданьня па выпуску запасных часьцей. «Зьвязда» прапануе Віцебскаму «Пралетару» і Гомельскай «Полесской Правде» арганізаваць супольны агляд работы заводаў сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва.

ЛЕНІНСКІЯ ДНІ ЗА МЯЖОЙ

Расстрэл рабочых дэманстрацый у Польшчы

ВАРШАВА, 23. Ленінскія дні ў Польшчы сёлета мелі бурны характар. На працягу апошніх дзён у Варшаве адбыліся шматлікія дэманстрацыі ў розных пунктах гораду. На аднэй з такіх дэманстрацый выступіў камуністычны дэпутат Сыпула.

Вакопіцы Варшавы былі ўпрыгожаны чырвонымі сьцягамі. Рабочыя перакінулі чырвоны сьцяг праз тэлеграфныя правады. Паліцыя лавіла дэманстрантаў. Праведзены шматлікія арышты сярод рабочых.

Каля Бепічу (Усходняя Галіцыя) адбылася вялікая сялянская дэманстрацыя. З узьнятымі сьцягамі дэманстранты накіраваліся да вёскі Людзічы. Вышэйшую насустрач паліцыю дэманстранты сустрэлі градам каменьняў, а пасьля гэтага памыкаліся ўварвацца ў памяшканьне паліцыі. Паліцыя адказала стрэлам: ДВОЕ ДЭМАНСТРАНТАЎ ЗАБІТА, НЕКАЛЬКІ ПАРАНЕНА. З паліцэйскіх двое зьбіты каменьнямі і палкамі. Арыштавана 16 сялян.

У Солтысах (Рава-Рускага павету) паліцыя дала залп па дэманстрантах. Адзін дэманстрант ЗАБІТЫ, двое цяжка паранена. Удзельнікі дэманстрацыі, абараняючыся, зьбілі трох паліцэйскіх. Арыштавана 13 чалавек.

У Градзяенцы дэманстравалі беспрацоўныя, якія сабраліся перад магістратам. Паліцыя атакавала дэманстрантаў. Адзін дэманстрант цяжка паранен ударам. Лёгка паранена — 5. Некалькі паліцэйскіх зьбіта.

У Здуньскай Волі адбыліся дэманстрацыі беспрацоўных, разагнаныя паліцыяй. Кіраўнікі дэманстрацыі арыштаваны.

У Саснавіцы ў дзень угодак сьмерці Леніна адбыліся бурныя дэманстрацыі беспрацоўных. Дэманстранты вялізарнай масай падыйшлі да магістрату і хацелі ўвайсьці ў памяшканьне.

З Сувалак, Львова і Краковa таксама паведамляюць пра спробы рабочых наладзіць дэманстрацыі і пра ўчыненыя паліцыяй масавыя арышты.

***

У сувязі з шостымі ўгодкамі са дня сьмерці Леніна, ва ўсіх буйных гарадох Нямеччыны, Англіі, Швэйцарыі, Амэрыкі і Галандыі адбыліся наладжаныя кампартыяй сходы і мітынгі.

У Шанхаі (Кітай) у розных часьцях гораду адбыліся шматлікія дэманстрацыі рабочых і студэнтаў. У праклямацыях, што распаўсюджваліся, адзначаліся ўгодкі сьмерці Леніна, апісваласі яго жыцьцё і дзейнасьць, а таксама заслугі перад кітайскай рэвалюцыяй і народамі Ўсходу. Паліцыя зрабіла шмат арыштаў.

У Тэмэшвары (Румынія) прафсаюзныя арганізацыі склікалі масавыя сходы, прысьвечаныя памяці Леніна, Лібкнэхта і Люксэмбург. Паліцыя разагнала дэманстрантаў пры дапамозе гумовых палак. **Арыштавана 35 чалавек.**

ПРЫКЛАД РАБОЧЫХ-КАЛОМЕНЦАЎ І НАШЫ ЗАДАЧЫ

Характэрная рыса нашага цяперашняга жыцьця—гэта яго надзвычайная бурлівасьць, шпаркасьць тэмпу і нябачнага росквіту творчасьці і ініцыятывы мас.

Сацэпаборніцтва, ударныя брыгады і прадпрыемствы, масавая капектывізацыя і ліквідацыя кулацтва, як клясы, сацыялістычныя гарады, шматтысячныя наборы ў ВНУ і г. д. і т. п.—вось яскравыя кадры генэральнай лініі нашага сёнешняга жыцьця.

У гэтым бурным сацыялістычным працэсе не заўсёды ёсьць магчымасьць усё прадугледзець, ацаніць і распляніваць. Гэта трудна таму, што жыцьцё на кожным кроку абгоняе ўсе нашы меркаваньні. Але толькі людзі, страціўшыя ўсякае бальшавіцкае пачуцьцё і веру ў масы, могуць скардзіцца на нейкі «хаос» і ўдарацца ў паніку з поводу вельмі шпарких тэмпаў. Наша партыя, якая ўсёй сваёй ленінскай папярэдняй палітыкай падрыхтавала сёнешні сацыялістычны рух мільёнаў, яна, як і раней, цьвёрда трымае руку на руле нашага сацыялістычнага карабля і ўпэўнена вядзе масу да канечнай мэты—да камунізму. Тое, што адбываецца сёньня на неабдымных абшарах Савецкага Саюзу, партыя расцэньвае, як рашучы штурм рэштак капіталізму ў краіне.

— Год вялікага пералому,—так назваў тав. Сталін 12-ю гадавіну пралетарскай рэвалюцыі. Гэтая характарыстыка найбольш поўна адбівае тое важнейшае і асноўнае, што характарызуе працэс нашай сучаснай работы. Сутнасьць пераломкага году заключаецца ў тым, што цяпер у будаўніцтва сацыялізму ўцягваюцца самыя глыбокія пласты мас, што пралетарыят, які 11 год кіраваў сацыялістычным будаўніцтвам, дзякуючы правільнай бальшавіцкай палітыцы партыі, зараз на справе павёў за сабою мільёны ня толькі бяднякцкага, але і серадняцкага сялянства на шлях сацыялістычнай перабудовы вёскі. Гэта дазваляе нам практычна замяніць кулацкую гаспадарку гаспадаркай калектыўнай і ліквідаваць кулацтва, як клясу.

Зусім зразумела, што гэтыя вялізарныя дасягненьні пралетарыяту ў галіне рэканструкцыі ўсёй краіны і іменна дробна-ўласьніцкай сельскай гаспадаркі пры захаваньні моцнага саюзу рабочае клясы і беднаты з серадняком, былі-б немагчымы без вялізарнага камуністычнага ўзросту самога пралетарыяту, без яго бальшавізацыі. Гэты працэс адбываўся нясупынна, атрымліваючы сваё найбольш яскравае адлюстраваньне ў паглыбленьні камуністычнай дысцыпліны і камуністычных мэтадаў працы на вытворчасьці (сацэпаборніцтва, ударніцтва, пасылка брыгад і 25.000 у вёску). Тое, што партыя так хутка і рашуча змагла разьбіць ідэалёгаў правага ўхілу, паказвае з аднаго боку на моцную яе сувязь з пралетарыятам, а з другога—зьяўляецца новым стымулам пашырэньня аўтарытэту і ўплыву партыі на шырокія пласты рабочае клясы і бяднякца-серадняцкіх мас.

Мы зьяўляемся зараз сьведкамі новых, нябачных яшчэ дагэтуль зрухаў.

«Мы прысутнічаем пры ператварэньні нашых заводаў ва ўдарныя прадпрыемствы. На нашых вачох сёньня ўзьнікаюць камуністычныя цэхі і майстэрні, заўтра—камуністычныя заводы і фабрыкі» (Молатаў).

Застрэльшчыкам гэтага новага выступаюць 10.000 пралетараў Каломенскага заводу. Што-ж адбылося там? А вось што: на мітынгу з поводу шостай гадавіны сьмерці Ўладзімера Ільліча Леніна і провадаў 100 рабочых, якія выяжджаюць на вёску, беспартыйная частка іх заявіла, што не жадае ехаць у вёску беспартыйнымі. Але гэта яшчэ ня ўсё. У той-жа дзень 12 вялікіх цэхаў Каломенскага заводу з агульным лікам у 3.613 рабочых заявілі аб уступленьні ў партыю, адначасова абвясьцілі свае цэхі ўдарнымі.

Тав. Молатаў, якому давялося быць сьведкай гэтых зьявішч у Каломне, у сваім артыкуле піша:

... «Гэты факт заяў цэлых цэхаў з некалькімі тысячамі рабочых аб жаданьні ўступіць у Ленінскую партыю, паказальны. Гэтага яшчэ ня было. Гэта—новае». І далей тав. Молатаў заўважае, што падзеі на Каломенскім заводзе «зьяўляюцца паказальнымі ня толькі для аднаго заводу». Гэта зусім правільна. Тое, што сёньня адбылося на Каломенскім заводзе, заўтра можа стаць магутным рухам усяго пралетарыяту, ахапляючы сабой сотні фабрык і заводаў. Прыклад каломенцаў азначае, што ўжо падыйшла пара, каб усё перадавое, ударнае ў пралетарыяце ўліваліся ў партыю, станавілася яе непарыўным зьвяном.

Вось гэта нам здаецца і адлюстроўвае прыклад пралетараў-каломенцаў. Нам могуць задаць пытаньне: у якой меры гэты прыклад характэрны для настрояў пралетарскіх мас Беларусі. Мы адказваем: так, ён характэрны і для пралетарыяту Беларусі, які зьяўляецца непарыўнай часткай усесаюзнага пралетарыяту і правяў нямала энэргіі і адданасьці ў правядзеньні сацэпаборніцтва, разьвіцьця ўдарных брыгад і калектывізацыі вёскі. Мы наглядалі ў дні шостай гадавіны сьмерці нашага правадыра У. І. Леніна, што пралетарыят Беларусі паслаў некалькі соцень сваіх лепшых ударнікаў кваліфікаваных рабочых з вялікім вытворчым стажам у партыю Леніна. Значыць, у нас ёсьць усе падставы для таго, каб новы важнейшы пачын каломенцаў падхапіць і скарыстаць для яшчэ большага разгортваньня ўдарнасьці на нашых прадпрыемствах і зрабіць выточным пунктам масавай вярбоўкі лепшых, перадавых рабочых у партыю. Зразумела, што менш за ўсё ў гэтай важнейшай рабоце могуць дапамагчы мэханічныя, насуп'ёзныя павярхоўныя мэтады. Наадварот, прыклад каломенцаў, як нельга лепш сьцьвярджае, што надыйшла пара рашучай зьмены і карэннага паляпшэньня мэтадаў масавай работы нашых партыйных арганізацый і ячэек. Размах, якасьць яе—усё гэта павінна быць павялічана ва многа раз. Стварыць з кожнага прадпрыемства камуністычнае прадпрыемства—вось куды павінен быць накіраваны галоўны ўпор партработы.

Жорсткая барацьба з правым апартунізмам і з «левым» фразёрствам, з няўзорнасьцю камуністых на прадпрыемстве, з абывательскім хвасьцізмам і г. д. становіцца галоўнейшай умовай сапраўднай перабудовы нашай работы і сапраўднага ахапленьня камуністычным уплывам пагалоўна ўсіх рабочых. Абавязак усіх партыйных арганізацый самым уважлівым чынам аднесьціся да таго, што адбылося ў Каломне,, пабальшавіцку яго зразумець і зрабіць выточным пунктам у штодзённай рабоце па бальшавізацыі радоў нашага пралетарыяту.

У гэтай рабоце трэба ні на мінуту не выпускаць з віду таго, аб чым гаварыць тав. Молатаў у сваім артыкуле *) пра пачын каломенцаў: «Шмат чаму мы павінны навучыцца ў нізавых арганізацый, у рабочых мас. У рабоце ўдарных брыгад на вытворчасьці,—дый ня толькі на вытворчасьці,—а таксама ў масавым калгасным руху вёскі, зараз раскрываюцца новыя сілы і новыя яшчэ нябачныя магчымасьці посьпехаў у нашай краіне.

Гэтыя посьпехі—посьпехі міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі.

БОЛЬШ УВАГІ ДА НОВАГА СЯРОД РАБОЧЫХ».

*) Гл. сёнешні нумар «Зьвязды».

ДА ПЛЕНУМУ МЕНСКАГА АК КП(б)Б

АРГАНІЗАЦЫЯ БЕДНАТЫ--НАЙПЕРШАЯ ЗАДАЧА КАМУНІСТА І КАМСАМОЛЬЦА НА ВЁСЦЫ

Наша партыя перайшла ў сваёй палітыцы ад абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулака да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі і арганічна з ёю зьвязаная палітыка ліквідацыі кулацтва, як клясы, ператварэньне дробнай індывідуальнай сельскай гаспадаркі ў буйную калектыўную будзе праходзіць ва ўмовах абвостранай і самай бязьлітаснай клясавай барацьбы. Гэта патрабуе ад партыйных, камсамольскіх, савецкіх, каапэрацыйных і іншых грамадзкіх арганізацый вёскі максымальнае ўвагі да пытаньняў арганізацыі батрацтва і беднаты, мабілізацыі яе на работу па раскулачваньні.

Што-ж зроблена мясцовымі арганізацыямі па арганізацыі беднаты вакол выкананьня дырэктыў партыі? Вось некалькі лічбаў, якія характарызуюць становішча работы з беднатой па Менскай акрузе: па 10 вясковых раёнах пры 570 выбраных органах існуе толькі 200 батрацка-бядняцкіх груп, пры 230 КСУ—толькі 30 груп, пры 51 с.-г. таварыстве—12 груп і г. д. Ня лепш стаіць справа і з якасьцю работы. Большасьць існуючых груп рэгулярнай работы не вяла, а разглядала толькі кампанейскія пытаньні, і таму ня здзіўляе, тое, што некаторыя сельсаветы па вёсцы аказаліся ў хвасьце бядняцка-серадняцкіх мас у справе сацыялістычнага перабудаваньня сельскай гаспадаркі.

Як-жа кіравалі работай сярод беднаты раённыя партарганізацыі?

Трэба проста сказаць, што належнага кіраўніцтва ня было; там-жа, дзе хоць што-небудзь і рабілася, дык рабілася фармальна, на-кампанейску. Заслаўскі, Койданаўскі і Бягомльскі РК за час ад акруговай канферэнцыі **ніат не абгаворвалі пытаньня аб стане і паляпшэньні работы з беднатой.**

Дырэктывы партыі, у тым, ліку і VII-ай Менскай акруговай партканфэрэнцыі ня выконваюцца.

Надыходзячы пленум АК КП(б)Б усёй рашучасьцю павінен будзе падкрэсьліць, што пасьпяховае ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнае рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, наладжаньне прадукцыйнай работы ў калгасах, задача ліквідацыі кулацтва, як клясы, магчымы толькі праз сыстэматычнае разгортваньне работы па самастойнай арганізацыі беднаты і батрацтва.

Партыйная і камсамольская арганізацыі павінны разгарнуць самую бязьлітасную барацьбу з правааапартыністычнымі чужымі нашай партыі настроямі, якія існуюць сярод пваасобных партыйцаў і камсамольцаў, настроямі ігнараваньня карэннай задачы партыі—задачы самастойнай арганізацыі беднаты і батрацтва на вёсцы.

Яўна нездавальняючае становішча з колькасьцю арганізаваных батрацка-бядняцкіх груп з усёй вострасьцю і настойлівасьцю ставяць перад партыйнай і камсамольскай арганізацыямі задачы максымальнага разгортваньня работы па арганізацыі батрацка-бядняцкіх груп пры ўсіх выбарных вясковых арганізацыях, прыцягваючы да практычнай работы ў групах усіх выбраных батракоў і беднякоў, рабочых і сельска-гаспадарчых рабочых, партыйцаў і камсамольцаў.

З усёй вострасьцю высоўваецца пытаньне аб арганізацыі да пачатку веснавой сяўбы, з батракоў і бяднякоў, выбраных у кіруючыя органы калгасаў, у калгасах, дзе не аграмаджаны сродкі вытворчасьці, і ва ўсіх калгасах Капыльскага і Сьмілавіцкага раёну, батрацка-бядняцкіх груп, налажыўшы ў аснову іх работы дапамогу партыйным арганізацыям у справе арганізацыі гаспадаркі, разгортваньне культурна-масавай работы, паляпшэньне быту калгасьнікаў і г. д.

Асноўнымі задачамі РК і ячэек на бліжэйшы час па рабоце сярод батрацтва і беднаты трэба лічыць: узмацненьне кіраўніцтва работай батрацка-бядняцкіх груп і сходаў беднаты з боку партыйных і камсамольскіх арганізацый, праз прымацаваньне лепшых работнікаў, пастаноўку дакладаў груп на партсходах, пэрыядычнае правядзеньне нарад кіраўнікоў і сходаў.

Трэба дабіцца поўнага ўсьведамленьня партыйнымі і камсамольскімі ячэйкамі арганізацыйнай структуры батрацка-бядняцкіх груп.

Трэба ўвесьці ў практыку пэрыядычнае скліканьне (у маштабе раённым, а ў калгасах—кусту) аднародных батрацка-бядняцкіх груп для абгаварэньня асноўных як гаспадарча-палітычных пытаньняў, так і пытаньняў, зьвязаных з работай тых органаў, пры якіх існуюць групы.

Фракцыі адпаведных арганізацый павінны ў сваёй рабоце забясьпечыць больш хуткае прасоўваньне і вырашэньне пытаньняў, што высоўваюцца групамі. РК і ячэйкі павінны зьвярнуць больш увагі на вылучэньне і падрыхтоўку гаспадарчых і культурных кадраў для работы на вёсцы непасрэдна з батракоў, сельска-гаспадарчых рабочых і лепшых беднякоў.

Трэба і надалей практыкаваць курсы па падрыхтоўцы батракоў у партыю, як сродак, які дае магчымасьць найбольш поўна ўцягваць батрацтва ў КП(б)Б.

Пры правядзеньні рознага роду курсаў па падрыхтоўцы кіраўнікоў асобных галін калектыўнае гаспадаркі, а таксама спэцыялістых па складаных с.-г. машынах (трактарыстыя, сыравары і г. д.) зьвярнуць асаблівую ўвагу на камплектаваньне за лік батрацтва.

Устанавіць за правіла і строга ім кіравацца, што шырокія раённыя нарады груп беднаты павінны праводзіцца ня менш 4-х раз у год, калепшыўшы якасьць іх работы.

Павінны быць рашуча асуджаны настроі аб ліквідацыі сельсаветаў, якія (настроі) ідуць з лягеру панных ворагаў. Разам з гэтым трэба разгарнуць самую энэргічную работу па стварэньні бядняцка-батрацкага ядра вакол сельсаветаў, таму што як гаворыць тав. Молатаў «толькі на падставе згуртаваньня батрацка-бядняцкага ядра, толькі на падставе настойлівай работы па арганізацыі беднаты вакол сельсаветаў, саветы на вёсцы справядна са сваімі задачамі. Няма і ня можа быць зараз другое, больш важнае задачы ў сельсаветаў, як сапраўднае згуртаваньне батрацка-бядняцкага ядра ў саветах і на гэтай падставе ўзмацненьне пралетарскага кіраўніцтва калгасным рухам і толькі пры

І. СТАЛІН

Да пытаньня аб палітыцы ліквідацыі кулацтва, як клясы

У № 16 «Красной Звезды», у артыкуле «Ліквідацыя кулацтва, як клясы», у апошнім бяспрэчна правільным, ёсьць дзьве недакладнасьці ў фармулёўках. Мне здаецца, што неабходна выправіць гэтыя недакладнасьці

1) У артыкуле зазначана:

«У пэрыяд аднаўленьня мы праводзілі палітыку абмежаваньня капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі. Пры пачатку пэрыяду перабудовы мы перайшлі ад палітыкі абмежаваньня да палітыкі іх выцясьненьня».

Гэтае палажэньне няправільнае. Палітыка абмежаваньня капіталістычных элемэнтаў і палітыка выцясьненьня іх гэта ня дзьве розныя палітыкі. Гэта тая самая палітыка. Пазбаўленьне ад капіталістычных элемэнтаў вёскі ёсьць няўхільны вынік і неадлучная частка палітыкі абмежаваньня капіталістычных элемэнтаў, палітыкі абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулацтва. Выцясьненьне капіталістычных элемэнтаў вёскі не зьяўляецца яшчэ выцясьненьнем кулацтва, як клясы. Выцясьненьне капіталістычных элемэнтаў вёскі ёсьць выцясьненьне і пераможаньне асобных атрадаў кулацтва, якія ня вытрымалі падатковага націску, ня вытрымалі сыстэматычнага захаду савецкай улады. Вядомая рэч, што палітыка абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулацтва, палітыка абмежаваньня капіталістычных элемэнтаў вёскі ня можа весьці да выцясьненьня асобных атрадаў кулацтва. З гэтае прычыны выцясьненьне асобных атрадаў кулацтва ня можа разглядацца інакш, як няўхільны вынік і неадлучная частка палітыкі абмежаваньня капіталістычных элемэнтаў вёскі.

Гэта палітыка праводзілася ў нас ня толькі ў пэрыяд аднаўленьня, але і ў пэрыяд рэканструкцыі, але і ў пэрыяд пасьля 15 зьезду (сьнежань 1927 г.), але і ў пэрыяд 16 канфэрэнцыі нашай партыі (красавік 1929 г.), як і пасьля гэтай канфэрэнцыі да лета 1929 г., калі настала ў нас паласа суцэльнай калектывізацыі, калі настаў пералом у бок палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Калі разгледзець галоўныя дакументы партыі, пачынаючы хоць ад 14-га зьезду ў сьнежані 1925 году (гл. рэзалюцыю на справаздачы ЦК) і канчаючы 16 канфэрэнцыяй у красавіку 1929 г. (гл. рэзалюцыю «Аб шляхох уздыму сельскае гаспадаркі»), дык нельга не заўважыць, што тэзіс аб «абмежаваньні эксплёататарскіх тэндэнцый кулацтва», аб «абмежаваньні росту капіталізму на вёсцы» заўсёды ідзе поруч з тэзісам аб «выцясьненьні капіталістычных элемэнтаў вёскі», аб «пераможаньні капіталістычных элемэнтаў вёскі».

Што гэта азначае?

Гэта азначае, што партыя не аддзяляе выцясьненьня капіталістычных элемэнтаў вёскі ад палітыкі абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулацтва, ад палітыкі абмежаваньня капіталістычных элемэнтаў вёскі.

15 зьезд партыі, як і 16 канфэрэнцыя, стаяць цалкам на базе палітыкі «абмежаваньня эксплёататарскіх імкненьняў сельска - гаспадарчай буржуазіі» (рэзалюцыя 15 зьезду «Аб працы на вёсцы»), на базе палітыкі «ўжыцьця новых захадаў, якія абмежоўваюць разьвіцьцё капіталізму на вёсцы» (гл. там-жа), на базе палітыкі «рашучага абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулака» (гл. рэзалюцыю 15 зьезду аб пяцігодцы), на базе палітыкі «наступленьня на кулака» у сэнсе «пераходу да далейшага, больш сыстэматычнага і настойлівага абмежаваньня кулака і прыватніка» (гл. там-жа), на базе палітыкі «яшчэ больш рашучага гаспадарчага выцясьненьня» «элемэнтаў прыватна - капіталістычнай гаспадаркі» ў горадзе і на вёсцы (гл. рэзалюцыю 15 зьезду на справаздачы ЦК).

Выходзіць, а) ня мае рацыі аўтар памянёнага артыкулу, паказваючы палітыку абмежаваньня капіталістычных элемэнтаў і палітыку іх выцясьненьня як дзьве розныя палітыкі. Факты кажуць, што мы маем тут справу з аднэй агульнай палітыкай абмежаваньня капіталізму, неадлучнай часткай і вынікам якое зьяўляецца выцясьненьне асобных атрадаў кулацтва.

Выходзіць, б) ня мае рацыі аўтар памянёнага артыкулу, запэўняючы, што выцясьненьне капіталістычных элемэнтаў вёскі распачалося толькі ў пэрыяд рэканструкцыі, у пэрыяд 15 зьезду. Сапраўды-ж справа выцясьненьня мела месца і да 15 зьезду ў пэрыяд аднаўленьня, і пасьля 15 зьезду — у пэрыяд рэканструкцыі. У пэрыяд 15 зьезду была толькі ўзмоцнена палітыка абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулацтва новымі дадатковымі мерамі, у сувязі з чым павінна было ўзмацніцца і выцясьненьне асобных атрадаў кулацтва.

2) У артыкуле зазначана:

«Палітыка ліквідацыі кулацтва, як клясы, палкам выплывае з палітыкі выцясьненьня капіталістычных элемэнтаў, зьяўляючыся працягам гэтай палітыкі на новым этапе».

Гэтае палажэньне недакладнае і таму—няправільнае. Вядомая рэч, што палітыка ліквідацыі кулацтва, як клясы, не магла скінуцца з неба. Яна была падрыхтавана ўсім папярэднім пэрыядам абмежаваньня, а значыць і выцясьненьня капіталістычных элемэнтаў вёскі. Але гэта яшчэ не азначае, што яна не адрозьніваецца грунтоўным чынам ад палітыкі абмежаваньня (і выцясьненьня) капіталістычных элемэнтаў вёскі, што яна зьяўляецца нібыта працягам палітыкі абмежаваньня. Гаварыць так, як кажа наш аўтар — значыць адхіляць наяўнасьць пералому ў разьвіцьці вёскі з лета 1929 году. Гаварыць так — значыць адхіляць той факт, што мы прарабілі за гэты пэрыяд паварот у палітыцы нашай партыі на вёсцы. Гаварыць так — значыць стварыць некаторае ідэалёгічнае ўкрыцьцё для правых элемэнтаў нашай партыі, якія чапляюцца цяпер за пастановы 15 зьезду супроць новай палітыкі партыі таксама, як чапляўся ў свой час тав. Фрумкін за пастановы 14 зьезду супроць палітыкі насаджэньня калгасаў і саўгасаў.

На чым грунтаваўся 15 зьезд, абвяшчаючы ўзмацненьне палітыкі абмежаваньня (і выцясьненьня) капіталістычных элемэнтаў вёскі? На тым, што, не зважаючы на гэтае абмежаваньне кулацтва, кулацтва, як кляса, усё-такі павінна застацца да часу. На гэтай падставе 15 зьезд пакінуў правамочным закон аб арэндзе зямлі, добра ведаючы, што арандатарам у сваёй масе зьяўляецца кулак. На гэтай падставе 15 зьезд пакінуў правамочным закон аб найме працы на вёсцы, патрабаваўшы яго дакладнага ажыцьцяўленьня. На гэтай падставе была яшчэ раз абвешчана недапушчальнасьць раскулачваньня. Ці супярэчаць гэтыя законы і гэтыя пастановы палітыцы абмежаваньня (і выцясьненьня) капіталістычных элемэнтаў вёскі? Бязумоўна, не. Ці супярэчаць гэтыя законы і гэтыя пастановы палітыцы ліквідацыі кулацтва, як клясы? Бязумоўна, так. Значыць, гэтыя законы і гэтыя пастановы давядзецца цяпер адкласьці на бок у раёнах суцэльнай калектывізацыі, сфэра распаўсюджаньня якое расьце ня днямі, а гадзінамі. Аднак, яны ўжо адкладзены на бок самым ходам калгаснага руху ў раёнах суцэльнай калектывізацыі.

Ці можна пасьля гэтага запэўнець, што палітыка ліквідацыі кулацтва, як клясы ёсьць працяг палітыкі абмежаваньня (і выцясьненьне)) капіталістычных элемэнтаў вёскі? Вядомая рэч, што нельга.

Аўтар памянёнага артыкулу забывае, што нельга выцясьніць клясы кулацтва, як клясы, мерамі падатковага і інакшага абмежаваньня, пакідаючы ў руках гэтае клясы зброю вытворчасьці з правам вольнага карыстаньня зямлёю і захоўваючы ў нашай практыцы закон аб найме працы на вёсцы, закон аб арэндзе, забарону раскулачваньня. Аўтар забывае, што пры палітыцы абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулацтва можна спадзявацца на выцясьненьне толькі асобных атрадаў кулацтва, што не супярэчыць, а наадварот, мяркуе захаваньне да часу кулацтва, як клясы. Каб выцясьніць кулацтва, як клясу, для гэтага недастаткова палітыкі абмежаваньня і выцясьненьня асобных яго атрадаў. Каб выцесьніць кулацтва, як клясу, трэба перамагчы ў адкрытай бойцы супраціўленьне гэтай клясы і пазбавіць яе вытворчых крыніц яе існаваньня і разьвіцьця (вольнае карыстаньне зямлёй, прылады вытворчасьці, арэнда, права найму працы і г. д.). Гэта і ёсьць паварот да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы. Бяз гэтага гаворка аб выцясьненьні кулацтва, як клясы, ёсьць нікчэмная мармытня, дагодная і выгодная толькі правым ухілістым. Бяз гэтага немагчыма ніякая сур'ёзная, а тым больш суцэльная калектывізацыя вёскі. Гэта добра зразумелі беднякі і серадняки нашай вёскі, якія грамяць кулацтва і ажыцьцяўляюць суцэльную калектывізацыю. Гэтага не разумеюць яшчэ, як відаць, некаторыя нашы таварышы.

Значыць, сучасная палітыка партыі на вёсцы ёсьць не працяг старое палітыкі, а паварот ад старое палітыкі абмежаваньня (і выцясьненьня) капіталістычных элемэнтаў вёскі да новай палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Сельсаветы, тварам да калгасаў!

Посьпехі калгаснага руху залежаць ад умацаваньня саветаў—органаў пралетарскае дыктатуры

УЗМОЦНІМ БАТРАЦКА-БЯДНЯЦКАЕ ЯДРО Ў САВЕТАХ

Перавыберам саветы, якія не стаяць на чале вялікага паходу за калектывізацыю

На ўсесаюзнай нарадзе пры ЦВК

Выступленьне дэлегатаў ад БССР

(Ад нашага маскоўскага карэспандэнта)

Спрэчкі па дакладу тав. Енукідзе пацьвердзілі правільнасьць меркаваньня тав. Калініна аб тым, што погляды аб адміраньні саветаў, якое пачалося на вёсцы, і замене іх праўленьнем калгасаў не атрымалі шырокага распаўсюджаньня, што толькі ня многія гарачыя галовы, як сказаў т. Калінін, маглі дайсьці да такога глупства. З 30 таварышоў, што выступалі ў спрэчках, ні ў аднаго ня было ноты сумненьня аб тым, што перад сельскімі саветамі стаяць вялікія палітычныя і эканамічныя задачы і што ролі нізавых саветаў, як органаў пралетарскай дыктатуры на вёсцы, яшчэ больш узрасьце ў зьвязку з масавым рухам калектывізацыі і сацыялістычнага перабудаваньня сельскае гас падаркі.

Работа саветаў сурова крытыкавалася. Але крытыка гэта была накіравана не на тое, каб паказаць, што многія саветы і ў цяперашнім складзе, пры існуючай іх канструкцыі і арганізацыйнай слабасьці ня ў стане выканаць тых задач, да якіх яны закліканы вялікімі зрухамі рэканструкцыйнага пэрыяду.

— Мы маем факты,—кажа тав. Клімянтоўскі (Армавірская акруга, Паўночны Каўказ), калі сельсаветы ішлі ў хвасьце руху калектывізацыі, ня прымалі ў гэтым руху ніякага ўдзелу, не дапамагалі яму. Мы маем адваротныя факты працідзейнасьці сельсаветаў калектывізацыі. Сельсаветы прывялі выконваць дырэктывы вышэйшых органаў, яны былі да гэтага часу толькі выканаўцамі, і калі яны стыкнуліся з новымі фактамі, то аказаліся ня ў стане правіць якую-небудзь самастойнасьць.

Што саветы часамі стаяць на чале антыкалектыўнага руху вёскі, гэта пацьвердзілі і іншыя таварышы.

Тав. Брандэнбурскі (Н.-Волскі край) падае факт, калі ў адным з раёнаў суцэльнай калектывізацыі з 27 членаў сельсавету 23 галасавалі супроць калектывізацыі.

Аднак трэба адзначыць, што сельсаветы нават у іх цяперашнім складзе, пры ўсім іх адставаньні ад тэмпаў жыцьця, ня страцілі значэньня органаў савецкай улады на вёсцы.

Тав. Бачэнік, старшыня сельсавету Вязаўскага раёну, Аткарскае акругі, гаворыць:

— Мы глядзелі на калгас, як на гаспадарчую арганізацыю, якой мы павінны дапамагаць. І мы дапамагалі ёй па меры сіл. Так, перад сяўбой мы высьветлілі, у якім стане знаходзіцца інвэнтар у калгаснікаў, у якім рамонце ёй мае патрэбу, якія патрэбны майстры, і мы арганізавалі арцелі цесьляроў, кавалёў, сьлесараў для рамонту калгаснага інвэнтару.

Прыкладаў такіх правільных узаемадносін паміж сельсаветамі і калгасамі на нарадзе было, аднак, паведамлена вельмі мала. Таварышы з дасьледча-паказальных раёнаў, дзе была праведзена рэарганізацыя нізавога савецкага апарату, паведамілі рад фактаў, якія сьведчаць, што рэарганізацыя дала станоўчыя вынікі і ў справе набліжэньня саветаў да насельніцтва і ў вытворчых адносінах. Тав. Валадзько (Віцебскі раён, Беларусь) паведамляе, што ў рэарганізаваных сельсаветах значна палепшылася землеўпарадкаваньне. Каморнікі, якія раней сядзелі ў акругах, цяпер працуюць у раёнах калектывізацыі. Іх можна спаткаць цяпер у полі на лыжах або на конях, у той час, як раней яны сядзелі ў канцылярыях. У адносінах загатовак паводле пляну Наркамгандлю Віцебская акруга павінна была даць значна менш, чым яна сапраўды дала. Тое-ж адносна загатовак бульбы. Замест 250 тыс. пуд. таварнае бульбы, паводле пляну аказалася магчымым загатовіць да 1 з пал. мін. пуд. (фактычна было загатоўлена 700 тыс. пудоў).

Другі прадстаўнік таго-жаў раёну тав. Ракаў спыніўся на зьмесьце работы нізавых органаў улады і на іх структуры. У Віцебскай дасьледча - паказальнай акрузе рэарганізаваныя сельсаветы пачалі ўжо працаваць пановаму. Але спраўдзівасьць патрабуе адзначыць, — сказаў тав. Ракаў,—што патрэбнай выразнасьці ў іх рабоце яшчэ няма. Па сутнасьці новая сыстэма зьяўляецца ўжо сыстэмай, якая спазьнілася. Тэмпы нашай работы, патрабаваньні практычнага жыцьця і палітычныя задачы выпярэджваюць нас. Для прыкладу тав. Ракаў падае работу зямельных камісій. Зараз гэта работа зьяўляецца ўжо анахранізмам у сувязі з тым, што зямляўпарадкаваньне будуць не індывідуальныя гаспадарцы, а калгасы. У Віцебскай дасьледча-паказальнай акрузе, — гаворыць тав. Ракаў, — мы зямельныя камісіі ліквідавалі.

Прыклады дасьледча - паказальных раёнаў, якія маюць яшчэ параўнальна невялікую практыку, паказваюць, як можна ўзьняць палітычнае і эканамічнае значэньне саветаў. На гэтае пытаньне і была зьвернута галоўная ўвага ў спрэчках.

Перш за ўсё ўсе згодны на тым, што трэба паскорыць перавыбары саветаў і асабліва ў раёнах суцэльнай калектывізацыі. Асноўная задача перавыбараў — палепшыць сацыяльны склад сельсаветаў, узьняць іх палітычнае і эканамічнае значэньне, стварыць з іх сапраўды нізавыя органы пралетарскай дыктатуры на вёсцы.

Асабліва востра стаіць пытаньне аб сацыяльным складзе сельсаветаў і аб кадрах сельсаветаў усе згодны з тым, што асноўная маса, з якое трэба браць людзей для абмену складу сельсаветаў — гэта батрацтва і беднята.

Якою павінна быць асноўная ўстаноўка абноўленых сельсаветаў?

І ў гэтым пытаньні разгалосьсяў няма —новыя сельсаветы пазьнны павярнуцца тварам да калектывізацыі вёскі, сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі, да ліквідацыі кулацтва, як клясы. Дзеля гэтага трэба ўмацаваць саветы палітычна і эканамічна. Тав. Брандэнбурскі прапануе значна пашырыць правы с.-саветаў. Сельсаветам павінны быць па яго думцы, дана права распускаць ліквэ-калгасы, права выдаваць абавязковыя пастановы, некаторыя судовыя правы ў адносінах пэўных катэгорый грамадзянскіх і крымінальных спраў, павінна быць таксама вырашана пытаньне аб бюджэтах сельсаветаў. Умацаваньне матар'яльнай базы сельсаветаў і павялічэньне іх палітычнага ўплыву—вось умовы, пры якіх сялянства пачне паважаць сельсаветы, як органы пралетарскай улады.

Адносна матар'яльнай базы сельсаветаў, — кажа т. Прадоф'еў, у многіх узьнікаюць сумненьні, скуль сельсавет будзе чэрпаць сродкі для існаваньня суцэльнай калектывізацыі. Гэтыя сумненьні не ўгрунтаваны. Асноўная крыніца сродкаў будзе знаходзіцца ў калгасах у выглядзе непадзельных фондаў, калгасы павінны будуць вылучыць пэўныя сумы для сельскага бюджэту. Матар'яльная база сельсаветаў застацца ранейшай—яна толькі відазьмяняецца.

Тое-ж адносіца і да функцый сельсаветаў. У раёнах суцэльнай калектывізацыі гэтыя функцыі ня толькі не памяншаюцца, яны, наадварот, значна вырастаюць. Усё, што гаварыў з гэтага повраду ў сваёй прамове т. Кагановіч, было падмацавана таварышамі з месц радам канкрэтных прыкладаў. У абавязкі сельсаветаў увойдуць ня толькі пытаньні будаўніцтва школ, больніц, клюбаў, дарог і г. д.,—ім прыдзецца, на думцы тав. Ефрэмава і інш., несьці інспекторыя пляцуючыя і рэгулюючыя функцыі, напрыклад: дапамагаць калгасам у арганізацыі збыту іх прадукцыі, рэгуляваць адыход рабочай сілы з калгасу, сачыць ня толькі за недапушчэньнем кулакоў у калгас, але і за выгнаньнем адтуль кулацкіх элемэнтаў, якія ўжо пралезьлі туды і г. д.

***

Нарада ўхваліла рэзалюцыю, у якой знайшлі адлюстраваньне ўсе асноўныя палажэньні, выказаныя ў дакладах т. т. Енукідзе, Кагановіча і Калініна і пацьверджаныя ўсім ходам спрэчак. Практычныя мерапрыемствы даручана распрацаваць прэзыдыуму ЦВК.

Закрываючы нараду, т. Калінін асабліва падкрэсьліў, што яна прайшла пад знакам тэарэтычнай распрацоўкі пытаньня аб ролі і задачах сельсаветаў. На нарадзе з поўнай яснасьцю выявілася роля сельсаветаў, як нізавых органаў пралетарскай дыктатуры, пад кіраўніцтвам якое яшчэ доўгі час будзе ісьці нашае сацыялістычнае будаўніцтва.

Нарада таксама поўнасьцю выкрыла безьзьмястоўнасьць і палітычную шкоду ўсіх гутарак аб тым, што калгасы здолеюць замяніць сабою сельсавет.

Тут была чутна суровая крытыка сельсаветаў, але гэта была крытыка, накіраваная на ажыўленьне, на ўмацаваньне сельсаветаў, за іх уздым. Нарада катэгарычна пацьвердзіла, што сельсаветы застануцца неадлучнай часткаю органаў улады і праваднікамі палітыкі партыі на вёсцы.

На гэтым тав. Калінін абвясьціў нараду закрытай.

І. Ран.

Менскі гарсавет мала дапамагае калгасам

Паводле пляну, Менскі прыгарадны сельсавет павінен быць пераведзены да вясны бягучага году на суцэльную калектывізацыю. Да апошняга часу ў прыгарадным сельсавеце было толькі 2 калгасы. Пачынаючы з студзеня месяца лік калгасаў стаў хутка павялічвацца. На сёнешні дзень у прыгарадным сельсавеце існуе ўжо 6 калгасаў. У бліжэйшы час будуць арганізаваны яшчэ два калгасы. У сярэднім па прыгарадным сельсавеце калектывізавана 60 процантаў пасеўнай плошчы.

Нядаўна каля Менску арганізаваны 2 садова - гародныя арцелі.

Трэба адзначыць, што гарсавет непасрэдна да гэтага часу не пасылаў членаў гарсавету для дапамогі мясцовым арганізацыям у правядзеньні калектывізацыі і падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі.

Ня вылучаў таксама гарсавет і сродкаў для дапамогі сельсавету ў правядзеньні пасеўнай кампаніі і калектывізацыі.

Л. Ц.

Падкулачнікі ў сельсаветах

(Ад нашага віцебскага карэспандэнта)

Тым, хто сёньня недаацэньвае кіруючай ролі сельсаветаў у калгасным руху і высоўвае новую «тэорыю»—ліквідацыі сельсаветаў у раёнах суцэльнай калектывізацыі, мы можам падаць рад фактаў, якія пераканаюць у памылковасьці такіх поглядаў.

Весткі з месц сьведчаць аб неабходнасьці хутчэйшай перабудовы ўсёй работы сельсаветаў і ператварэньня іх у баявыя штабы калектывізацыі, якія-б адказвалі за ўсю работу па калгасным будаўніцтве.

Між тым, на справе ў радзе раёнаў сельсаветы адносіцца вельмі нядбайна да калектывізацыі і ня толькі не дапамагаюць калгасному руху, а нават шкодзяць яму.

Так, у Унаўскі сельсавет, Лёзьнянскага раёну, пралезьлі кулакі Аляксеяў і Вінаградаў, у недалёкім мінулым арганізатары бандыцкіх шаек. Яны вядуць актыўную барацьбу супроць калектывізацыі і з калгаснікамі - актывістамі. Настаўніка Вараб'ёва—арганізатара беднаты і калгасаў яны ледзь не давялі да самагубства розными правакацыйнымі плёткамі і хлусьнёю.

Члены Шумнянскага сельсавету Кулякоў і Дзерабін замест наступленьня на кулака, выступаюць супроць калгаснага будаўніцтва. Члены Гладанскага сельсавету (Лёзьнянскі раён) Голубеў і Лазавік, супольна з кулакамі зрывалі сходы, прысьвечаныя пытаньням арганізацыі калгасу.

Ня лепшымі аказаліся і член Бешанковіцкага райвыканкому Цапота, сакратар Віклоскага сельсавету Каваленка і член сельсавету Кульгава. Усе яны выступалі супроць калектывізацыі і раілі сваім бацьком сваяком у калгасы ня ісьці. Па пастанове сходу беднаты Кульгава за агітацыю супроць калектывізацыі павінна быць выведзена са складу сельсавету. Вось частка прыкладаў становішча некаторых сельсаветаў, склад якіх засьмечаны кулацкімі і варожымі нам элемэнтамі. Гэтыя сельсаветы трэба заараз-жа пераабраць.

Сельсаветы, якія падтрымліваюць кулакоў

У Койданаўскім раёне кулацтва вядзе шалёную барацьбу з калгасным рухам. Кулакі пядаўна падкупілі аднаго несьвядомага адсталага селяніна Боўка, які забіў сакратара Бароўскага сельсавету Бэсмана, аднаго з лепшых змагароў за калектывізацыю. Кулакі запалохваюць беднату, пагражаюць расправай.

Рад сельсаветаў ня толькі не вядзе барацьбы з выступленьнямі кулацтва, але нават падтрымлівае кулакоў. Так, члены Бароўскага сельсавету Вішнеўскі і Бакіпаў, на агульных сходах галасавалі супроць калектывізацыі, а перад сходамі вялі агітацыю сярод сялянства, супроць уступленьня ў калгасы.

Пленум Бароўскага сельсавету пастанавіў ужо выключыць іх са складу сельсавету і аддаць пад суд за агітацыю супроць мерапрыемстваў савецкай улады.

Член Нарэйкаўскага сельсавету Петрашкевіч на нарадзе з кулакамі распрацаваў плян ліквідацыі маемасьці і жыцьёлы, назаўтра ён, сумесна з кулакамі, павёў прадаваць сваю жыцьёлу. У гэтым сельсавеце яшчэ і зараз ідзе разбазарваньне жыцьёлы. Сельсавет нічога ня робіць для барацьбы са шкодніками-кулакамі.

САРОКА.

Сельсаветы не павярнуліся тварам да калгасу

Сельсаветы нашай акругі не заўсёды стаяць на чале калгаснага будаўніцтва. Моцны рух бядняцка-серадняцкіх мас шмат дзе ня ўзяты пад нагляд кіраўніцтва сельсаветаў. Ёсьць і такія месцы, дзе сельсаветы і іх працаўнікі ня толькі стаяць у баку, а часамі перашкаджаюць калектывізацыі.

У вёсцы Кіжын, Парыцкага раёну, ёсьць 15 гаспадарак, якія жадаюць уступіць у калгас, але сельсавет ня ідзе насустрач гэтым гаспадаркам і нічога ня робіць, каб ім дапамагчы. У вёсцы Коўрыне (Бабруйскі раён) член Варатынскага сельсавету Дашкоўскі выступіў з калгасу, другі член сельсавету Прахневіч выступае на сходах супроць калектывізацыі.

Пытаньне абагуленьня маемасьці, жывёлы і насеньня ў панава арганізаваных калгасах таксама абмінае сельсаветы. Яны гэтым амаль зусім ня цікавяцца. Большасьць сельсаветаў прызвычаіліся ў сваёй рабоце да ўмоў паасобнага індывідуальнага двара.

Калі зараз замест соцень дробных гаспадарак перад сельсаветам стаіць некалькі буйных абагуленых—сельсавет ужо ня ведае, як падыйсьці да іх. Зьмяніць формы працы, прасякнуць у калгасы, пацікавіцца іх вытворчымі плянамі, дапамагчы з свайго боку—гэтага большасьць сельсаветаў яшчэ ня здолелі, яны яшчэ не павярнуліся тварам да калгасаў і стаяць у баку ад калгаснага будаўніцтва. Часта гэтаму перашкаджаюць ворагі калектывізацыі — падкулачнікі, якія пралезьлі ў сельсавет і накладваюць свой варожы адбітак на ўсю яго работу.

Зараз некаторыя сельсаветы пачалі ўжо ачышчаць свой склад ад варожых элемэнтаў, так зрабіў Салонскі сельсавет, Жлобінскага раёну, выкінуўшы падкулачніка Палітаева. Так зрабіў Гарадзенскі сельсавет, Рагачоўскага раёну, выкінуўшы са свайго складу 8 падкулачнікаў—актыўных працаўнікаў калектывізацыі.

Н. К.

Усебеларуская нарада па дасьледчай справе

Дасьледчая справа не адказвае задачам сацыялістычнай рэканструкцыі с.-г.

20-га студзеня адкрылася ўсебеларуская нарада па дасьледчай справе. Праграмай прадугледжваецца заслухаць каля 10 асноўных дакладаў на пленарных пасяджэньнях і некалькі дэсяткаў дакладаў на сэкцыях. Аднак, пасьля адкрыцьця нарады пастаноўлена было значна скараціць праграму яе работы і зьвяць з парадку дня заслуханьне дакладаў на сэкцыях.

Найбольшую ўвагу выклікаў даклад Наркамзему БССР т. Рачыцкага і суседклад рэктара Беларускай сельска-гаспадарчай акадэміі т. Пінчука аб задачах дасьледчай справы ў БССР. У спрэчках выявіўся вельмі прыкры малюнак стану дасьледчай справы ў нашай рэспубліцы.

Папершае, да гэтага часу яшчэ «канкуруюць» навукова-дасьледчыя інстытуты імя Леніна ў Менску з акадэміяй у Горках. Замест таго, каб работу сваю узгодніць, і ў Менску і ў Горках часта займаюцца вывучэньнем адных і тыхжа самых тэм, прычым такіх, якія ў радзе выпадкаў не прадстаўляюць пікай цікавасьці для сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Навукова-дасьледчыя інстытуты, які арганізаваўся некалькі год назад, закліканы быў упарадкаваць дасьледчую справу, арганізаваць рад новых дасьледчых станцый, трымаць з імі самую цесную сувязь. Дэлегаты з месц адзначылі, што інстытут ні ў якай ступені з гэтымі сваімі задачамі ня справіўся. У цяперашні час дасьледчая справа ў БССР фактычна дэзарганізавана. Кожная станцыя робіць тое, што хоча—хто ў лес, а хто на дровы. Дасьледчых станцый, праўда, арганізавана шмат, але ніхто ня цікавіцца тым, чым чыя займаюцца. Нават павярхоўнае азнаямленьне з дзейнасьцю нашых дасьледчых станцый гаворыць аб тым, што яны ніякай карысьці пры існуючай сыстэме іх работы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі прынесьці ня могуць.

Цікава адзначыць, што дасьледчыя ўстановы не вырашылі такога пытаньня, як жывёлагадоўля. У Віцебскай акрузе ні адзін з закладзеных станцый дасьледчых вучасткаў ня даў вынікаў. Вялізарныя грошы былі выкінуты на вецер.

Большасьць дэлегатаў адзначала, што дасьледчая справа ў БССР яшчэ да сёньняшняга дня разьлічана выключна на індывідуальніка і зусім ігнаруе буйную сацыялістычную гаспадарку. Цікава, што яшчэ існуе інстытут сялян-дасьледчыкаў, сярод якіх большасьць кулакоў. Ні адзін калгас ці саўгас ня прыцягнуты да дасьледчай справы. І цяпер яшчэ кулакі маюць магчымасьць карыстацца прывілеямі з прычыны таго, што яны нібы ядуць культурную гаспадарку. Навукова-дасьледчы інстытут засьмечаны чужым элемэнтам. Прычынаўчына яшчэ ня вынгнана са сьцен інстытуту. Кіраўніцтва інстытуту, складзенае пры Прышчэпаве, яшчэ не адпоўлена.

Пазаўчора нарадай быў заслуханы даклад праф. Дубаха аб мэліярацыі ў БССР. Спрэчак па гэтым дакладу чамусьці пастаноўлена было не адкрываць.

Ц.

Аб рэарганізацыі апарату ЦК і АК КП(б)Б

Гутарка з тав. ГАНТМАНАМ

Загадчык аргаддзелу Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б тав. Гантман у гутарцы з нашым супрацоўнікам аб мэтах і задачах рэарганізацыі партапарату паведаміў наступнае:

Рэарганізацыя апарату ЦК і АК КП(б)Б паводле пастановы Цэнтральнага Камітэту ўсеКП(б) дыктуецца вялізарным ускладненьнем задач партыйнага кіраўніцтва ва ўмовах рэканструкцыйнага пэрыяду.

Партыйны апарат на ўсіх этапах і крутых паваротах поўнасьцю спраўляўся з пастаўленымі перад ім задачамі і перамагаў усе труднасьці і перашкоды ў сваёй практыцы. Але партыя ніколі не адмаўлялася ад рэарганізацыі і перабудовы партапарату ў адпаведнасьці з новымі задачамі і тэмпамі будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне. Ставячы пытаньне аб рэарганізацыі партыйнага апарату, нельга ні ў якім разе гаварыць аб нейкім зьнижэньні і паслабленьні ролі і значэньня партапарату. Наадварот, у аснове рэарганізацыі ляжыць задача максымальнага яшчэ большага ўзмацненьня партыйнага апарату.

Ня выключана магчымасьць, што правапартуністычныя, трацкісцкія і паўтрацкісцкія элемэнты будуць імкнуцца скарыстаць пастанову ЦК аб рэарганізацыі партапарату ў мэтах дыскрэдытацыі апарату нашай партыі. Гэтым спробам трэба даць сваячасовы і жорсткі адпор. Трэба выкрываць антыпартыйную сутнасьць гэтых спроб і рэзка ўдарыць на іх посьбітах.

Потым тав. Гантман спыніўся на мэтадах і прынцыпах рэарганізацыі апарату Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б і акруговых камітэтаў партыі. Арганізацыйны аддзел ЦК, — сказаў тав. Гантман, — рэарганізуецца ў два аддзелы: арганізацыйна - інструктарскі і аддзел разьмеркаваньня. «Орграспред» да гэтага часу быў вельмі перагружаны работай па разьмеркаваньні і перастаноўцы работнікаў, ня маючы магчымасьці за няцца паглыбленай прапрацоўкай некаторых важнейшых пытаньняў арг-партбудаўніцтва. За мінулыя гады ў партыі накапілася вялізарная арганізацыйная практыка, якая яшчэ ня вывучана і не абагулена. Пры рэарганізацыі партапарату гэты вучастак работы будзе ўзмоцнены. Шпаркія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, — кажа далей тав. Гантман, — высоўваюць на першы плян праблему падрыхтоўкі і вылучэньня пралетарскіх кіраўнічых кадраў. «Орграспреды» пры сваёй сучаснай структуры ня здолеюць поўнасьцю справіцца з пастаўленымі перад імі задачамі ў сувязі з праблемай кадраў. Пры рэарганізацыі-ж работа па падрыхтоўцы і разьмеркаваньні кадраў на лініі адміністрацыйна - гаспадарчай, прафэсыянальнай і г. д. палкам пераходзіць да стварэньня аддзелу разьмеркаваньня. Гэта дасьць магчымасьць арганізацыйна - інструктарскім аддзелам умацаваць сувязь з нізавымі партарганізацыямі, паставіць на патрэбную вышыню вывучэньне мясцовае практыкі і абмен вопытам работы. Арганізацыйна-інструктарскія аддзелы будуць мець магчымасьць больш паглыблена заняцца прапрацоўкай пытаньняў арпартбудаўніцтва.

Потым тав. Гантман ахарактарызаваў прычыны і задачы рэарганізацыі АПАД ЦК і АК КП(б)Б. Зусім зразумела, — кажа тав. Гантман, — чаму зараз насьпела патрэбнасьць вылучэньня з АПАД новага аддзелу агітацыі і масавых кампаній. Гэтае вылучэньне дыктуецца новымі тэмпамі і задачамі культурнага будаўніцтва, а таксама баявой задачай павышэньня тэарытычнага ўзроўню партыйных мас. З арганізацыяй гэтага аддзелу мы атрымаем магчымасьць яшчэ больш паглыбіць і ўзмацніць вывучэньне і прапаганду ленінізму, паглыбіць штодзённую масавую агітацыю сярод шырокіх рабочых і батрацка-бядняцка-серадняцкіх мас і г. д. Гэтыя аддзелы будуць непасрэдна займацца арганізацыяй усіх масавых кампаній правільнай расстаноўкай сіл і дасканалым вучотам вынікаў гэтых кампаній.

Рэарганізацыя жанаддзелаў, — сказаў потым тав. Гантман, — выклікана вялізарным значэньнем работы сярод работніц, батрачак, бяднячак - калгасьніц і сераднячак у пэрыяд разгорнутага сацыялістычнага наступленьня на клясавага ворага і ліквідацыі кулацтва, як класы. На даным этапе асабліва значэньне набываюць задачы ўцягненьня новых соцень тысяч актыву з работніц і асноўных мас сялянак у сацыялістычнае будаўніцтва. Гэта будзе ажыцьцёўлена толькі тады, калі жанработай будуць займацца ўсе аддзелы партыйных камітэтаў, саветы, прафсаюзы. Нельга дапусьціць, каб усе гэтыя задачы былі ўскладзены толькі на плечы жанаддзелаў.

Пасьля тав. Гантман спыніўся на пытаньнях рэарганізацыі аддзелаў па рабоце на вёсцы. Тав. Гантман падкрэсьліў, што вясковыя аддзелы парткомаў, створаныя ў той пэрыяд, калі калектывізацыя яшчэ не набыла масавых разьмераў, цалкам і поўнасьцю справіліся з ускладзенымі на іх задачамі. Але ў сучасны момант, калі калгаснае будаўніцтва разгортваецца бурнымі і магутнымі тэмпамі, калі нэпля раёны, акругі і вобласьці пераходзяць на рэйкі суцэльнай калектывізацыі, патрэбнасьць існаваньня самастойных вясковых аддзелаў мінавала. Зараз работа на вёсцы набыла новае значэньне і таму ўся яна павінна перайсьці да адпаведных аддзелаў парткомаў (арганізацыйна - інструктарскіх, аддзелаў масавых кампаній і г. д.).

Па пастанове ЦК ўся рэарганізацыя партапарату будзе праведзена за два тыдні. Пытаньне-ж аб рэарганізацыі работы апарату РК і

„НАЛЁТ“ НА ЗЕМОРГАНЫ

БАЯВЫХ ТЭМПАЎ У ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЯЎБЫ НЯМА

ЦЭНТРАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ МАЛА ВЕДАЮЦЬ АБ САПРАЎДНЫМ СТАНОВІШЧЫ НА МЯСЦОХ

Арганізацыя налёту

Рэдакцыямі, газэт «Зьвязда» і «Рабочай» быў арганізаваны налёт рабочых брыгад на цэнтральныя і акруговыя ўстановы з мэтай праверкі падрыхтоўкі іх да веснавой пасеўнай кампаніі. У налёце прымалі ўдзел рабкоры, супрацоўнікі рэдакцый, студэнты камвузу і брыгада ЎсеЦСПС.

Былі абсьледаваны Наркамзем, Белсельбанк, Белкалгассаюз, Малочна-жывёлагадоўчы саюз, Белсельтрэст, Белпаляводсаюз, Менакрза, Менакркалгассаюз і інш.

Налёт выявіў, што апараты гэтых устаноў не дабіліся баявых тэмпаў у галіне падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, што яны не ахапляюць стыхійнага росту калгаснага будаўніцтва, вакол падрыхтоўкі да сяўбы яны на здолелі мабілізаваць савецкую грамадзкасьць.

Пляны вандруюць па канцылярыях

Дрэнна абстаіць справа з давядзеньнем плянаў сяўбы да асобных вёсак і калгасаў.

Асобныя часткі агульнага пляну Наркамзему яшчэ дагэтуль поўнасьцю не разасланы на акругах у той час, як паводле дырэктывы, яны павінны да 25-га сьнежня быць па месцы.

Менакрза толькі 10-га студзеня разаслаў па раёнах пляны пасеўнай кампаніі. Пляны не даведзены да асобных вёсак. У Сьмілавіцкім раёне пляны не даведзены да калгасаў.

Плян веснавой пасеўнай кампаніі, распрацаваны Менакркалгассаюзам, дагэтуль яшчэ не зацьверджаны акрыпанам і не даведзены да раёнаў і калгасаў.

Белкалгассаюз распрацаваў плян прамысловага будаўніцтва ў калгасах, але дагэтуль плян не зацьверджаны адпаведнымі органамі, і затрымліваецца падрыхтоўка да будаўнічага сэзону.

Вытворчыя планы, выпрацаваныя Белкалгассаюзам, выяўляюць сабою «пэдэўр» цяпяніны: у пляне—31 старонка; для таго, каб запоўніць такі плян агранам павінен патраціць ня менш 5-6 дзён.

Белмалжывсаюз толькі 6-га студзеня разаслаў па акругах плян падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Акругі нічога не зрабілі наконт складаньня вытворчых пляноў па малочна-жывёлагадоўчай справе. У большасьці раёнаў дагэтуль не распрацавана пытаньне аб кантрактацыі малака і кармовай базе.

Наркамзем, Калгассаюз і інш. арганізацыі ня маюць вестак аб тым, што робіцца ў адносінах пляноў на мясцох, яны ня ўжылі ніякіх мер, каб праверыць, як выконваюцца пасланыя пляны і дырэктывы.

Дрэнна ідзе ачыстка і загатоўка насеньня

Паводле вестак Наркамзему БССР, на 10 студзеня ачышчана толькі 8,6 проц. вызначанай плянам колькасьці. Ня гледзячы на паляўнасьць вялікай колькасьці машын па ачыстцы збожжа, ачыстка ідзе павольна, бо працаўнікі мясцовых арганізацый мала увагі аддаюць гэтай справе.

Белсельтрэст у свой час разаслаў саўгасам прапанову засяваць выключна ачышчаным, адсартаваным і пратручаным насеньнем. Як-жа ідзе ачыстка гэтага насеньня? На 20-ае студзеня з 183 саўгасаў прыслалі весткі толькі 42, але і па гэтых 42 саўгасах ачыстка праводзіцца слаба. Па некаторых саўгасах ачышчана ўсяго 10,8 проц. У адным саўгасе ў Койданаўскім раёне з-за нядбайнасьці прыдзецца ў другі раз ачышчаць 1.000 пудоў аўсу.

Вельмі слаба ідзе ачыстка насеньня і па камітэтах узаемаданамогі. Дагэтуль ЦК КСУ не атрымаў ніякіх вестак аб ходзе ачысткі насеньня. ЦК тлумачыць дрэнную ачыстку тым, што ўся ўвага месяц адцягнута кампаніяй перавыбараў сельскіх камітэтаў узаемаданамогі.

Менакркалгассаюз таксама ня мае ніякіх вестак аб ходзе ачысткі насеньня. Некаторыя папярэднія паведамленьні гавораць, што ачыстка насеньня ў калгасах Магілёўшчыны праходзіць незадавальняюча.

Некалькі слоў аб **загатоўках насеньня.**

Паводле даных Наркамзему, Паляводсаюз дагэтуль загатовіў 30 проц., патрэбнай колькасьці канюшыны, 24 проц. вікі, 96 проц. аўсу, 25 проц. кораніплодаў. Белкавсаюз ня прыслаў яшчэ вестак, але па некаторых даных можна меркаваць, што загатоўка насеньня, асабліва траў, спажывецкай кааперацыяй праводзіцца вельмі слаба: напрыклад, трэба было загатовіць лубіну 4.654 тоны, загатоўлена—40 тон. Асабліва адстаюць у адносінах загатовак Менская, Аршанская і Бабруйская акругі.

Паводле даных Белкалгассаюзу, загатоўка насеньня, асабліва культурных траў, па калгасах праводзіцца вельмі слаба. Па Клімавіцкім раёне да 10-га студзеня навіна было паступіць вікі 32 тоны, паступіла—5,7 проц. гэтай колькасьці.

Канюшыны трэба было загатовіць 5 тон, загатоўлена 0,2; лубіну трэба было загатовіць 5 тон, загатоўлена 0,2, ячменю—0,5 тоны замест 64, аўсу—42,6 тоны замест 443.

Няма выразнага кіраўніцтва

Брыгады зацікавіліся таксама пытаньнем **абагуленьня жывёлы**, разьвіцьця жывёлагадоўлі ў калгасах.

Паводле даных брыгад, абагуленьне жывёлы ідзе нездавальняюча. Белкалгассаюз ня даў выразных дырэктыў у гэтым пытаньні, Менакркалгассаюз сваім абежнікам прынёс вялікую шкоду справе абагуленьня жывёлы. Калгассаюзы ў радзе акруг слаба кіруюць пабудовай двароў для жывёлы.

Па лініі Белкалгассаюзу было адпушчана 508 тыс. руб. на арганізацыю прыгарадных малочных калгасаў. Але калгассаюз нічога пе ведае аб тым, што робіцца для куплі жывёлы. У некаторых мясцох аграномы падыходзяць вельмі фармальна да адбору пародзістай жывёлы, патрабуючы афіцыяльнай «радаслоўнай» каровы або каня.

Беларускі малочна-жывёлагадоўчы саюз зусім ня мае вестак аб выніках абагуленьня жывёлы. Інструктары, якія выяжджалі на месцы, займаліся рэарганізацыяй малочнай сеткі і вельмі мала ўвагі зьвярнулі на пытаньні абагуленьня жывёлы ў новых калгасах, кантрактацыі малака і жывёлы.

Жывёлагадоўля ў новых калгасах пастаўлена дрэнна, памяшканьні не прыстасаваны да правільнага трыманьня жывёлы. Ня зьвернута ніякай увагі на правядзеньне кантрактацыі малака, што ставіць пад пагрозу гэту важнейшую кампанію ў галіне жывёлагадоўчай праблемы.

Брыгады сабралі шмат цікавых даных аб **ходзе рамонту с.-г. інвэнтару.** Па Менскай акрузе, паводле пляну, трэба было арганізаваць 36 рамонтных майстэрань і кузьняў, абсталяваць і папоўніць інструмантамі, аднак дагэтуль яшчэ не прыступілі да арганізацыі новых майстэрань і да абсталяваньня існуючых. Толькі гэтымі днямі завезена 12 тон жалеза для абсталяваньня рамонтных майстэрань у Сьмілавіцкім і Копыльскім раёнах.

Менакркалгассаюз ня мае ніякіх вестак аб тым, як праходзіць рамонт с.-г. машын на акрузе.

У заключэньне амаль усе брыгадзіры адзначылі адзначаюць вельмі слабы збор **попелу**, што павінен замяніць штучныя ўгнаеньні, у якіх будзе адчувацца недазват.

Ар. Ар.

„Мы прысутнічаем пры пераўтварэньні нашых заводаў ва ўдарныя прадпрыемствы. На нашых вачох сёньня ўзьнікаюць камуністычныя цэхі і майстэрні, заўтра—камуністычныя фабрыкі і заводы“

Новае сярод рабочых

(Артыкул тав. МОЛАТАВА)

Тое, што мне сёньня давялося ўбачыць і даведацца на Каломенскім заводзе, заслугоўвае сур'ёзнае ўвагі і, бясспрэчна, зьяўляецца паказальным ня толькі для аднаго заводу.

Вялікі мітынг, дзе прысутнічала пераважная частка рабочых 10-цітысячнай масы заводу, быў прысьвечаны 6-й Ленінскай гадавіне і разам з тым провадам адпэй сотні рабочых-каломенцаў у вёску. Мітынг адлюстраваў уздым актыўнасьці ў рабочых масах, аб чым лепш за ўсё можна меркаваць па некалькіх фактах з жыцьця заводу.

Вось гэтыя факты. Каломенскі завод павінен быў выдзеліць 100 актывістых рабочых для работы ў вёсцы. На заклік партыі адгукнулася не адна, а некалькі соцень рабочых. У выніку пасьля пільнага адбору вылучана неабходная група і, па агульнай думцы, вылучана сапраўды з лепшых пралетараў. Дадам да гэтага яшчэ адзін штрых: з вылучанай сотні адна трэць аказалася беспартыйнымі. Перад адъездам яны заявілі, што ня хочуць ехаць у вёску беспартыйнымі. Усе патрабуюць прыняцьця іх заяў аб уступленьні ў партыю. На заводзе 390 ударных брыгад з 3 000 рабочых. Колькасьць ударнікаў расьце. Праўда, вытворчая праграма за першы квартал ня выканана поўнасьцю. Верна, і тое, што прадукцыйнасьць працы яшчэ адстае ад росту зарплаты. Парэшце, у арганізацыі вытворчасьці і ў рабоце тэхнічага пэрсаналу яшчэ многа недахопаў. Але энэргія ўсіх мясцовых арганізацый накіравана ў адзін пункт: на выкананьне вытворчай праграмы. І ня можа быць сумненьня, што гэта актыўнасьць можа зламаць і зломіць перашкоды на шляху выкананьня вытворчых заданьняў. Ва ўсякім выпадку, усе мясцовыя таварышы пацьвярджаюць паўнасьць цьвёрдых настрояў рабочых за тое, каб ня толькі выканаць, але і перавыканаць вытворчую праграму.

У адносінах росту партыйнай арганізацыі на Каломенскім заводзе справа амаль да апошняга часу абстаяла кепска. Яшчэ некалькі месяцаў назад удзельная вага камуністых сярод рабочых была толькі нямногa больш 10 проц. Для буйнейшага металюргічнага заводу, для заводу, які будуе паравозы, вагоны, дызэлі і г. д. такое становішча ніяк нельга прызнаць здавальняючым.

І вось, парэшце, падышоў пералом. За апошнія месяцы ў партыю ўступіла 200 рабочых. Да ленінскіх дзён было падана 300 новых заяў, але гэта было толькі чымсьці, накшталт прадмовы. Характэрны і паказальны апошні сёньняшні факты.

За апошнія тыдні ў цэхавых ячэйках праходзіла справаздачная кампанія партыйных кіраўнікоў. Гэта кампанія скансалідавалася якраз сёньня на цэхавых сходах. **І сёньня-ж 12 цэхаў Каломенскага заводу ў поўным складзе заявілі аб жаданьні ўступіць ва ўсеКП(б).**

Вось больш падрабязныя даныя: цэхі, колькасьць рабочых. Машынна-зборачны — 740, паравоз-кавальскі, гідраўлічна-прэсавы, штампавачна-рэсорны—678, кацёльны—467, аўтагенны—120, сталяліцейны—843, вагонна-мэханічны—210, вагонна-зборачны—175, дрэваапрацоўчы—325, малярны—65, усяго па 12-ці цэхах—3.613 чалавек.

Усяго ў гэтых 12 цэхах—3.613 рабочых. Усе яны заявілі аб сваім жаданьні ўступіць у рады ленінскай партыі. Можна яшчэ дадаць, што на блізкай да заводу абутковай фабрыцы два цэхі таксама заявілі аб сваім аднадушным жаданьні ўступіць ва ўсеКП(б).

Зразумела, заявы рабочых 12 цэхаў Каломенскага заводу, як і іншыя калектыўныя заявы, будуць разглядацца партыйнымі арганізацыямі з абгаварэньнем кожнага кандыдата паасобку. Зразумела, што пры аднагалосным галасаваньні цэлых цэхаў знойдуцца і такія рабочыя, якія галасавалі з салідарнасьці («Не заставацца-ж аднаму»). Аднак, гэты факт заявы цэлых цэхаў з некалькімі тысячамі рабочых аб жаданьні ўступіць у ленінскую партыю—паказальны. Гэтага яшчэ ня было. Гэта—новае.

Да ўступленьня ў партыю нашы рабочыя прывыклі адносіцца сур'ёзна. Гэта **лішні раз** пацьвердзілася ў часе чысткі **партыі**, калі беспартыйныя рабочыя ўсімі сваімі адносінамі да справы зноў і зноў паказалі, што партыя ў іх вачох мае выключны аўтарытэт, які яны ахоўваюць ад усіх і ўсякіх сумніцельных «партыйцаў». І ў даным выпадку з боку каломенскіх рабочых мы бачым такія-ж адносіны.

Каломенцы ня проста заявілі аб жаданьні ўступіць у камуністычную партыю. Цэхі, якія вынесьлі такую пастанову, абвясьцілі сябе ўдарнымі цэхамі. Рабочыя добра ведаюць, што іх першым абавязкам зьяўляецца падмацаваць сваё ўступленьне ў партыю максымальнай актыўнасьцю на вытворчасьці, на рабоце ў заводзе. Таму цэхі абвяшчаюць сябе ўдарнымі на вытворчасьці і бяруць на сябе абавязацельства ісьці ў авангардзе па выкананьні і перавыкананьні вытворчай праграмы. **Такім чынам, мы прысутнічаем пры пераходзе нашых заводаў ва ўдарныя прадпрыемствы. На нашых вачох сёньня ўзьнікаюць камуністычныя цэхі і майстэрні, заўтра—камуністычныя заводы і фабрыкі.**

У гэтым знаходзіць сваё адлюстраваньне нешта новае сярод рабочых. Гэта прымушае гаварыць кіраўнікоў заводзкіх арганізацый аб нічуваным уздыме ў рабочых масах. Ня з сёньняшняга дня пачаўся гэты ўздым. Ня з сёньняшняга дня пачалося разгортванне на фабрыках о заводах сацыялістычнае спаборніцтва, і перадавыя рабочыя пачалі пераходзіць на ўдарныя брыгады. Пачаўшы з моладзі, гэты новы ўздым у рабочых масах цяпер вылілеецца ў новыя, яшчэ ніколі ня меўшыя месца формы. Прыклад з Каломенскім заводам—толькі паказальнік таго, што адбылося ў апошнія месяцы ў рабочай клясе.

Шостая ленінская гадавіна будзе, як відаць, тым моментам, калі гэты пералом у росьце актыўнасьці рабочых мас выявіцца з поўнай відавочнасьцю. Ня можа быць сумненьня ў тым, што заклік УсеЦСПС да стварэньня з паўмільёна рабочых новых ленінскіх ударных брыгад на фабрыках і заводах будзе ажыцьцёўлены. З гэтых перадавых рабочых калён наша партыя атрымае магутнае надмацаваньне ў выглядзе новага «ленінскага набору». Тое новае, што зараз вызьлілася сярод рабочых, цесна зьвязана з пераломам, які адбыўся ў вёсцы. І адно на другое робіць зараз вялізны ўплыў.

У апошнюю палову мінулага году адбыўся рашучы пералом у сялянскіх масах. Селянін павярнуў да камунізму. Калгасны рух разьлівацца на сялянскіх палёх і ня можа адбывацца бяз грукату раскулачваньня. Да веснавой пасеўнай кампаніі мы павінны падыйсьці, як да рашаючай ня толькі гаспадарчай, але і палітычнай задачы, як да рашаючага моманту калектывізацыі для ўсіх асноўных с.-г. раёнаў СССР.

Што ляжыць у аснове пералому, які адбыўся ў вёсцы? Няма патрэбы гаварыць, што 12 год савецкай улады, што работа партыі, саветаў, прафсаюзаў, кааперацыі і г. д. падрыхтавалі за гэтыя гады паказаны пералом. Савецкі лад і ленінская палітыка партыі на 12-м годзе пралетарскай рэвалюцыі забясьпечылі паварот сялянскіх мас да камунізму. Але, парэшце, рашаючае значэньне да падрыхтоўкі гэтага пералому мелі нашы посьпехі ў аднаўленьні індустрыі, нашы дасягненьні ў ажыцьцяўленьні палітыкі сацыялістычнай індустрыялізацыі. Уздым прамысловасьці і кансалідацыя рабочае клясы на гэтай аснове зрабілі именна такое рашаючае ўзьдзейнічаньне на сялянскія масы. У пераможным аднаўленьні гаспадаркі савецкай уладай, у шпаркім росьце сацыялістычнай індустрыі, у згуртаваньні рабочых мас пад камуністычным сьцягам—перш за ўсё закладзены асновы пералому сацыялістычнай перабудовы, што адбыўся ў вёсцы. Канчаткова-ж селянін,—ня толькі бядняк, але і серадняк,—павярнуў да калектыўнае гаспадаркі тады, калі савецкая ўлада, у імкненьні забясьпечыць хлебам рабочых і Чырвоную армію, стала ўзмоцнена разгортваць наступленьне на кулака і разам з тым пачала стварэньне матэрыяльна саўгасы з высокай машыннай тэхнікай і буйнейшыя калгасы з перадавых сялян, якія паказалі селяніну практычны шлях пераходу да сацыялістычнага зямляробства. Цяпер ясна, што наша сельская гаспадарка ўжо на ўсім фроце перабудоўваецца па-сацыялістычнаму.

Гэты пералом у вёсцы ў сваю чаргу ня мог не адбіцца ў рабочай клясе. У рабочай клясе ён выклікаў новы ўздым актыўнасьці, які пераліваецца цяпер у новыя, яшчэ нячуваныя формы. Наколькі рабочыя чула прыслухоўваюцца да таго, што робіцца ў вёсцы, і наколькі горача яны падтрымліваюць калектывізацыю сельскае гаспадаркі, гэта відаць з вялізнага ўздыму ў рабочых масах у сувязі з мабілізацыяй 25.000 рабочых у вёску. Прыклад з Каломенскім заводам кідае сьвятло на новыя зьявішчы ў рабочым асяродзішчы. На другіх заводах па тым-жа шляху ідуць ударныя брыгады, якія заяўляюць аб сваім жаданьні далкам увайсьці ў рады ленінскай партыі. **Новае сярод рабочых у тым, што грамадзкая актыўнасьць, якая накапляецца за апошнія гады ў іх асяродзішчы, пераходзіць цяпер у бурны прыліў рабочых мас у партыю, у магутнае будаўніцтва ўдарных калён пралетарыяту на заводах. Ствараюцца камуністычныя цэхі і камуністычныя заводы. Ствараюцца ўдарныя брыгады, ударныя батальёны, ударныя арміі на вытворчасьці.** Камуністычны рух уладае пралетарыятам.

Новае сярод рабочых прад'яўляе новыя патрабаваньні да ўсіх пралетарскіх арганізацый, у першую чаргу, да іх кіраўнікоў. Перабудова партыйнай работы, перабудова і аднаўленьне прафсаюзнага апарату, савецкага апарату і г. д., чысткі арганізацый ад усякай завалі і гнілі з самым рашучым прыцягненьнем у работу ўсіх пралетарскіх арганізацый, вырасшых новых кадраў з рабочых,—усё гэта цяпер патрэбна нам, як ніколі. Новы і яшчэ нячуваны па сваім размаху ўздым у рабочых масах патрабуе не малых здольнасьцей ва ўсіх формах і мэтадах нашай работы. Многаму мы павінны тут вучыцца ў нізавых арганізацый, у рабочых мас.

У рабоце вытворчых нарад па вытворчасьці, дый ня толькі на вытворчасьці,—а таксама ў масавым калгасным руху ў вёсцы зараз раскрываюцца новыя сілы і новыя, яшчэ нячуваныя, магчымасьці посьпехаў у нашай краіне. Гэтыя посьпехі—посьпехі міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі.

Больш увагі новаму сярод рабочых.

В. МОЛАТАЎ.

23 студзеня 1930 году.

Ленінскі прызыў ударнікаў

УСІМ ПРАЛЕТАРАМ САВЕЦКАГА САЮЗУ

ТАВАРЫШЫ!

21 студзеня — 6 год з дня сьмерці найвялікшага—правадыра пралетарскай рэвалюцыі Леніна.

У ленінскія дні мы падагульваем вынікі пройдзенага шляху і, кіруючыся вучэньнем Леніна, вызначаем далейшы свой шлях. Акружаныя з усіх бакоў імпэрыялістычнымі ворагамі, ва ўмовах найнастрэйшай клясавай барацьбы, рабочая класа, пад кіраўніцтвам слаўнай камуністычнай партыі, вядзе пераможнае будаўніцтва сацыялізму ў першай краіне пралетарскай дыктатуры. У гісторыю барацьбы рабочае клясы за сацыялізм 1929-ты год увойдзе ня толькі як першы год вялікай пяцігодкі, але і як год масавага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва. Ідэя Леніна аб арганізацыі спаборніцтва на сацыялістычных пачатках хутка аўладае масамі і становіцца гіганцкай сілай. Сацыялістычнае спаборніцтва сапраўды «камуністычны мэтад будаўніцтва сацыялізму». Спаборніцтва ўдарыла па прагулах, падняло крывую прадукцыйнасьці, ліквідавала прарывы першых двух кварталаў мінулага гаспадарчага году і зрабіла рэальным лёзунг, пад знакам якога прайшоў 1-шы зьезд ударнікаў **«пяцігодку за чатыры гады».**

Сацыялістычнае спаборніцтва вызначыла буйнейшыя палітычныя зрухі ў сьвядомасьці працоўных, яно выклікала магутны рух ударных брыгад, яно падняло на нябывалую вышыню творчую ініцыятыву мас.

Пралетарыят нашай краіны, штурмуючы на сьцягам сацыялістычнага спаборніцтва нявольніцкія тэмпы работы, расхлябанасьць і нядбайнасьць, пад кіраўніцтвам партыі ў барацьбе з правымі апартуністымі, з панікёрамі і дэзэртырамі сацыялістычнага будаўніцтва, выпачыў яшчэ больш высокія і напружаныя тэмпы будаўніцтва на другі год пяцігодкі.

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі мы ў гэты другі год пяцігодкі падыходзім да апошніх рашаючых баёў з капіталізмам у нашай краіне, да баёў за ліквідацыю кулацтва, як класы.

Ва ўмовах шалёнага супраціўленьня кулацка - капіталістычных элемэнтаў, ва ўмовах рэзкага абвастраньня клясавай барацьбы адбываецца сацыялістычная перабудова сялянскае гаспадаркі. Суцэльная калектывізацыя раёнаў, акруг і цэлых абласьцей стала гіганцкім рухам бяднацка - серадняцкіх мас, які прад'яўляе высокія патрабаваньні да прамысловасьці. Тым больш недапушчальным і пагражаючым зьяўляецца адставаньне прамысловасьці ад плянавых заданьняў, якое вызначылася ў першы квартал гаспадарчага году. Невыкананьне вытворчых праграм і якасных паказальнікаў у мэталюргіі, у машынабудаўніцтве, у вугольнай і жалезарудным прамысловасьці ёсьць сур'ёзны прарыў па адным з самых рашаючых участкаў сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтаму прарыву ніякіх апраўданьняў няма і ня можа быць.

Шматлікія спасылкі на аб'ектыўныя ўмовы — гэта шлях чыноўнікаў, якія прабуюць прыкрыць сваю бездапаможнасьць у справе мабілізацыі мас на барацьбу за гаспадарчыя пляны. Адзэй з рашаючых прычын гэтых прарываў зьяўляецца тое, што сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарны рух ня сталі яшчэ практычнай справай найшырэйшых мас працоўных, між тым, калі тэмпы і паказальнікі першага году пяцігодкі будуць ажыцьцёўлены перадавымі кадрамі рабочых, то кантрольныя лічбы і прамфінпляны другога году пяцігодкі кожнага прадпрыемства, цэху, агрэгата павінны быць выкананы ўсёй масай. «Ня там, дзе тысячы, а там, дзе мільёны, пачынаецца сур'ёзная палітыка» навучаў нас Ленін. 100-процантнае выкананьне кантрольных лічбаў прамфінпляну павінна стаць справай сацыялістычнага гонару кожнага пралетара Савецкай краіны.

Рабочая класа нашай краіны ня раз у рашаючыя дні паказвала цуды гэраізму і самаадданасьці.

У першы год пяцігодкі на барацьбу з гаспадарчымі труднасьцямі, за выкананьне пляну выступіла першая когорта ленінцаў у тэмпах — ударнікі. Гэта яны прапесьлі на сваіх плечах праз мноства перашкод ідэю Леніна аб сацыялістычным спаборніцтве.

У дні 6-й гадавіны сьмерці Леніна, гэніяльнага настаўніка пралетарыяту, у адказ на зрывы вытворчых праграм і паказальнікаў УсеЦСПС і ЦК УсеЛКСМ абвяшчаюць з 21 студзеня ленінскі прызыў рабочых ва ўдарныя брыгады.

Гэты прызыў павінен даць новыя сотні тысяч ударнікаў рэвалюцыянэраў тэмпаў, стойкіх барацьбітоў за будаўніцтва сацыялізму.

Кожны перадавы рабочы павінен у ленінскія дні прыступіць да арганізацыі новых ударных брыгад.

Ленінскі прызыў ва ўдарныя брыгады павінен абярнуць спаборніцтва тысяч у спаборніцтва мільёнаў, павінен вырашыць задачу пагалоўнага ўцягненьня мас у сацыялістычнае спаборніцтва.

Ня менш 500 тысяч новых ленінскіх ударнікаў — лепшая памятка аб Леніну, лепшае выкананьне яго наказаў аб сацыялістычным спаборніцтве.

На ўсіх заводах і фабрыках павінны быць арганізаваны мітынгі, сходы і канфэрэнцыі рабочых з абгаварэньнем задач ленінскага прызыву і выпікаў першага кварталу гаспадарчага году.

Ударныя брыгады павінны стаць арганізатарамі ленінскага прызыву. Арганізацыя ленінскага прызыву будзе баявым экзэмэнам кожнага прафсаюзу, заводзкага камітэту, іх уменьню на справе ажыцьцяўляць паварот «тварам да вытворчасьці».

На ленінскім прызыве будзе праверацца дзейнасьць кожнай камсамольскай арганізацыі, яе здольнасьць вырашыць задачу пагалоўнага ўцягненьня камсамольцаў ва ўдарны рух.

Ленінскі прызыў падыме новую магутную хвалю сацыялістычнага спаборніцтва, створыць ращучы пералом у справе выкананьня пяцігодкі—найлепшая памяць аб Леніну. Ленінскі прызыў ва ўдарныя брыгады павінен даць тысячы новых ударнікаў, новых барацьбітоў за рэвалюцыйныя тэмпы нашага сацыялістычнага будаўніцтва».

Неадкладна разгарнуць ленінскі прызыў

ДЗЕНЬ ПАХАВАНЬНЯ ЛЕНІНА—ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ПРЫЗЫВУ

23-га студзеня ЦСПСБ за подпісам старшыні тав. РЫЖОВА разаслаў усім акрпрафбюро тэлеграму наступнага зьместу:

«Арганізуйце 27, у дзень пахаваньня Леніна, мітынгі на заводах аб вярбоўцы ленінскага прызыву ўдарнікаў. Матар'ял у «Труде» ад 21 студзеня».

Учора такога-ж зьместу тэлефанаграмы пераданы ўсім цэнтральным праўленьням саюзаў.

Учора-ж усім акрпрафбюро пасланы сьпешны ліст за подпісам адказнага сакратара ЦСПСБ тав. АВЕРЬНА, у якім прапануецца разгарнуць шырокую кампанію па арганізацыі вярбоўкі ленінскага прызыву ўдарнікаў. Брыгадам ЦСПСБ, якія зараз знаходзяцца ў акругах па абсьледаваньні ходу падрыхтоўкі да пасеўкампаніі, прапанована аказаць акрпрафбюро дапамогу ў арганізацыі пе нінскага прызыву ўдарнікаў.

Пазаўчора адбылося пасяджэньне бюро ЦК ЛКСМБ, якое ў выкананьне пастановы ЦК УсеЛКСМ і УсеЦСПС аб пенінскім прызыве ўдарнікаў, прапанавала ўсім акругкомам, райкомам і вытворчым ячэйкам, разам з прафарганамі, тэрмінова прыступіць да арганізацыі пе нінскага прызыву ва ўдарныя брыгады, «сэнс якога ляжыць у тым, каб ударныя тэмпы ў працы распаўсюдзіць на самыя шырокія колы рабочых».

Бюро ЦК ЛКСМБ прапануе зараз-жа прыступіць да самай шырокай растлумачальнай працы аб значэньні ленінскага прызыву ўдарнікаў у справе зьнішчэньня гаспадарчых прарываў, у справе выкананьня вытворчых заданьняў, зьніжэньня сабекошту, павышэньня прадукцыйнасьці працы, росьце прадукцыі і г. д.

27 студзеня, у дзень пахаваньня Леніна, па ўсіх заводах трэба правесьці лятучыя мітынгі наконт пенінскага набору.

Работу па правядзеньні ленінскага прызыву ЦК ЛКСМБ абвясьціла ўдарнай, прапанаваўшы акругкомам кожныя 10 дзён інфармаваць ЦК аб ходзе ленінскага набору.

«Больш шырокае ўцягненьне рабочых ва ўдарныя брыгады—гаворыцца ў пастанове ЦК ЛКСМБ,—для хутчэйшага выкананьня пяцігодкі—найлепшая памяць аб Леніну. Ленінскі прызыў ва ўдарныя брыгады павінен даць тысячы новых ударнікаў, новых барацьбітоў за рэвалюцыйныя тэмпы нашага сацыялістычнага будаўніцтва».

Чыгуначныя майстэрні гатовы да рамонту машын,

а акрземаддзелы чакаюць загадаў зьверху

Віцебскі завод „Чырвоны Мэталісты“ недавырабіў 24.000 плугоў

Наркамзем ня ведае...

У сувязі з недахватам с.-г. рамонтных майстэрань, чыгуначныя майстэрні Беларусі, ў падыходзячай рамонтнай кампаніі змаглі-б адыграць вялікую ролю.

Ужо прайшло больш за месяц, як саюзны Наркамзем, НКШЗ і ЦК саюзу чыгуначнікаў далі канкрэтныя дырэктывы аб пераводзе чыгуначных майстэрань на рамонт с.-г. інвэнтару.

Ня раз сыгналізавала аб гэтым «Зьвязда», але справа яшчэ дагэтуль ня зрушана з месца.

У Наркамземе БССР гавораць, што вінаваты чыгуначныя арганізацыі, а ў кіраўніцтве ўпоўнаважанага НКШЗ ківаюць на Наркамзем. Наркамзем паведамляе, што ўжо даўно даны дырэктывы ўсім акрземаддзелам, калгасцэнтру аб тым, каб прыступіць да дачы заказаў чыгуначным майстэрням. Але выкананьне гэтай дырэктывы не праверала.

Наркамзем ня ведае, што зроблена ў гэтай галіне. **Менскі акрземаддзел, які ў сябе пад бокам мае чыгуначныя майстэрні ў Менску, наогул ня ведае аб такой дырэктыве Наркамзему БССР. Акрземаддзел усё яшчэ чакае загаду.**

Упоўнаважаны НКШЗ паведаміў нашаму супрацоўніку, што чыгуначныя арганізацыі прыцыпова дагаварыліся з Наркамземам, майстэрні гатовы да пераходу на рамонт с.-г. машын і трактароў, **але зямельныя органы, калгасы не даюць заказаў. Наркамзем дагэтуль ня даў канкрэтных даных аб колькасьці машын, якія патрабуюць рамонту, аб разьмерах заказаў.**

Учора на прэзыдыуме Белбюро ЦК саюзу чыгуначнікаў прадстаўнік паравоза-рамонтнага заводу імя Ланцуцкага ў Гомелі скардзіўся на тое, што ўжо месяц, як відуцца перагаворы з зямельнымі органамі, але толку нічога ня выходзіць. Гомельскія майстэрні зьяўляюцца найбольш буйнымі ў Беларусі і змаглі-б да надыходзячай веснавой пасеўнай кампаніі адрамантаваць значную колькасьць трактараў і с.-г. машын. Для рамонту можна было-б скарыстаць ліцейны і мэханічны цэхі, якія стаяць ня загружанымі.

Мы тут павінны зазначыць, што прафэсыянальныя арганізацыі чыгуначнікаў **таксама вельмі мала зрабілі, каб зрушыць рамонтную справу ўперад.**

М. К.

Забясьпечыць выкананьне вытворчага пляну зав. „Чырвоны Мэталісты“

Беларуская арганізацыя «Сельхозснаб» зрабіла абсьледваньне, як ідзе падрыхтоўка і выраб с.-г. машын да надыходзячай веснавой пасеўнай кампаніі на віцебскім заводзе «Чырвоны Мэталісты».

Абсьледваньне выявіла, што прылады і машыны, патрэбныя для надыходзячай веснавой сяўбы (плугі і акучнікі) выробляюцца вельмі нездавальняюча. Так, да вырабу акучнікаў і сячкарань да гэтага часу нават ня прыступлена.

Лічбы вырабу плугоў сьведчаць аб невыкананьні плянаў да пасеўнай кампаніі.

Так, плугоў «Сухені № 1» было запланавана вырабіць у першым квартале 140 шт.—выраблена ўсяго 2.305. «Сухені № 2» было намечана 1.500 шт., а да гэтага часу яшчэ зроблена плугоў ня зроблена. Такое-ж становішча з плугамі № 5-В «СП 5. гра-мадзянін» і інш. Усяго ў першым квартале адгружана 24.500 шт. плугоў.

Па акучніках замест запраектаваных да выробу ў першым квартале 1.000 шт. пакуль што выраблен толькі адзін пробны акучнік.

«Сельхозснаб» зьвярнуўся да ВОНГ, Наркамзему і НК РСІ з просьбай прыняць тэрміновыя меры да ўзьвышэньня прадукцыйнасьці працы «Чырвонага Мэталістага» і забясьпечыць поўнае выкананьне пляну выробу патрэбных с.-г. машын да веснавой пасеўнай кампаніі.

Цікава адзначыць, што завод «Чырвоны Мэталісты» тлумачыць невыкананьне пляну адсутнасьцю мэталю. Рэвізія паказала, што завод з посьпехам выконвае заказы на с.-г. машыны і прылады, якія ня маюць сэзоннага значэньня. Такім чынам, тлумачэньне Белмэталятрэсту аб адсутнасьці мэталю ня мае ніякай вартасьці. Увесь актыў заводу, прафарганізацыі павінны прыняць усе меры, каб у другім квартале поўнасьцю выканаць плян выробу патрэбных с.-г. машын да веснавой пасеўнай кампаніі.

ЛЕНІНСКІЯ ДНІ У БССР

У партыю Леніна

У ленінскія дні па заводах і фабрыках Менску адбыліся жалобныя вечары, прысьвечаныя памяці Уладзімера Ільліча Леніна. Дзесяткі перадавых рабочых і работніц калектыўна ўступілі ў рады КП(б)Б. Многія рабочыя і работніцы абвясьцілі сябе ўдарнікамі.

45 рабочых пераплётнага цэху друкарні **Белдзяржвыдавецтва** абвясьцілі сябе ўдарнікамі сацыялістычнага спаборніцтва. Ударнікі калектыўна падалі заявы аб ўступленьні ў рады партыі. Падалі заявы т.т. **Нінбург**, рабочы, на вытворчасьці працуе 20 год, актыўны ўдзельнік сацыялістычнага спаборніцтва, **Цыгельнік**, мае 22-гадовы вытворчы стаж, **Фальдман** звыш 15 год працуе на вытворчасьці, **Навіцкі, Ліпэрт, Струнскі** і г. д.

***

На заводзе **«Дрэваапрацоўшчык»** у ленінскія дні на адкрытым партсходзе было прынята ў партыю 10 рабочых ад варштату: т. **Ткачык**, мае 18-гадовы вытворчы стаж, **Рубінштэйн**, мае 17-гадовы вытворчы стаж, **Лазоўскі, Ромэр** і г. д. Усе гэтыя таварышы зьяўляюцца ўдарнікамі сацыялістычнага спаборніцтва.

Рабочыя «Дрэваапрацоўшчыка» пастанавілі адпрацаваць у адзнаку ленінскіх дзён адзін дзень у карысьць калектывізацыі.

***

На гарбарні **«Бальшавік»** у ленінскія дні перадавыя рабочыя і работніцы падалі заявы аб прыёме ў КП(б)Б. Падалі заявы т.т. **Асановіч, Дордзіг, Аляшкевіч, Суражынскі, Левін, Кантаровіч, Данішэўскі, Глайхэнгауз, Канапацкі** і г. д. Усе падаўшыя маюць вялікі вытворчы стаж.

***

На Эльводзе ў ленінскія дні 10 рабочых уступілі ў рады партыі.

Жалобнае пасяджэньне Менакругкому КП(б)Б

22-га студзеня ў доме культуры адбылося жалобнае пасяджэньне Менскага акругкому КП(б)Б разам з членамі

З жыцьця АДУ арміі

ЗА АРКАЙ МЯЖЫ

(Ад нашага спэц. карэспандэнта)

III

У начной цемры, па стэпу пранёсься ледзь чутны гул. Залацістым зьяяньнем агнёў іскрылася ў чорнай далі Манчжурыя. Ля савецкай граніцы ў кітайскіх акопах нічога ня чулі і не маглі ня ўставіць, што адбывалася гэтай ночу. У маўклівай ночы хваляю рынуліся палкі Чырвонай арміі.

**
*

Калі генэральскі аўтамабіль ля манчжурскага гатэлю дарэмна чакаў канца сакрэтных нарад, камандаваньню Чырвонай арміі былі вядомы пляны Лян Чжун-цзая.

Суткамі войска чакала загаду адбіць удар. Стаўшы дыханьне, у прамёралай калючай траве суткамі, не раскладаючы адрадніцкіх вогнішчаў, падціснуўшы вінтоўкі, грэючыся цеснатой цел, байцы чакалі. Ні пылінкі сьнегу ў стэпу. Пякучае, нібы над тропікам, сонца, блакітнае, нібы ў Італіі, неба і злы манчжурскі мароз, які сухім полымем апальвае скуру і, здаецца, здольны ўсё жывое ператварыць у попел. У жоўтай траве, над блескучай блакітнасьцю дзён, пад зьвярыным бляскам начных зорак ляжалі байцы.

Чырвоная армія дзейнічала, як дакладная машына. Артылерыя забяспечыла пяхоце пілях, танкі ў чырвоных танкістых сталі спрытнымі, нязвычайна хуткімі і здагадлівымі. Танкі ў сэкунды прахоздзілі ўперад і засланялі небясьпечныя вучасткі, выратоўваючы атрады. Бура та-мангольскі эскадрон лунаў, разгарнуўшыся лёзам бліскучых клінкоў, вогненыя коні ляцелі нязвычайнай віхурай, камандзіры ўперадзе сваіх войск несьліся ў атаку, тры разы параненыя, ня выпускаючы вінтоўкі, шаблі, кулямёта, агрызаючыся на мімалётныя словы таварышоў, білі ўперад... З песьнямі «За власть советов», «К бою готовы» міма праносіліся роты, чырвоныя зоркі самалётаў ляталі над акопамі і крэпасьцямі...

У паніцы ўцякалі варожыя банды. Салдаты скідалі боты, курткі, штаны, шапкі і беглі, як напалоханыя ваўкі, каналерыстыя не маглі іх дагнаць. Да раніцы апошнія кітайскія часьці ўцяклі ў Хархонтэ, па дарозе кідалі коняй, вінтоўкі, нікі, гарматы, адзеньне. Чырвонаармейцы спынілі пагоню, занялі разьезд.

Генэрал Лян з галоўнымі сіламі, што сабраліся вакол Манчжуры, ашыцуўся ў кольцы савецкіх войск.

Гэта было так хутка, так нечакана, што, згубіўшы ўсякі розум, генэрал паспрабаваў прарвацца ў глыбіню краіны, але ўсюды, куды ня кідаліся салдаты, стаяла савецкая коньніца, артылерыя, на варце стаялі стральцы...

Агонь змоўк. У Чжалайноры час ад часу з вышак стралялі белагвардзейцы: іх лавілі на дахах, у сутарэньнях, у хлявох, у кутках двароў. Устанавілася мёртвая цішыня. Ціпер чакалі, калі адгукнецца генэрал Лян, бо ня быў-жа ён настолькі дурным, стары генэрал, каб не зразумець, што няма выхаду. Манчжурыя была зваду, заставалася чакаць і мяняцца ўражаньнямі.

Толькі зараз выявіліся зьдзіўляючыя эпізоды мінулых гадзін, толькі зараз можна было-б пачуць расказы, даведацца, што рабілася ў вагні схватак. Чырвонаармейцы качалі камандзіраў, віншавалі і дзякавалі іх — верных правадыроў. У часе бою, калі камандзіры кінуліся на самыя рызыкоўныя вучасткі, чырвонаармейцы пасьпявалі пасьцяць дэлегатаў і тыя паўзьлі да камандзіраў з просьбай берагчы сябе. Так не ўсьцярогся камандзір кулямётнай роты Тазаў. Выстраляўшы ўсе патроны, ён аласлаў усіх назад, а сам адстрэльваўся з «нагана». Паранены кулямётчык цягнуў кулямёт на плечах і адбіваўся шаблай, чырвонаармейцы кідаліся адзін на дваццаць і на трыццаць бандытаў... Жывыя легэнды нарадзіліся ў чжалайнорскіх сопках, бо абаранялі мірную краіну даверaныя працоўных. Так маглі змагацца толькі рэвалюцыянэры.

Мірная цішыня супакоіла станцыю, а за мяжою ў Даўрыі на аэрадроме зьяжаліся лётнікі.

Адзін самалёт чамусьці дзіўна доўга кружыўся над аэрадромам. Не разумеючы, у чым справа, стаялі ўніз чакаўшыя, самалёт як быццам ня мог вырвацца з вышыні. Ён доўга кружыўся, нарэшце, плаўна спусьціўся, але лётнік ня выходзіў з кабіны. Людзі, што зьбеглісь, убачылі кроў у шчыліне дзьвярэй. Дзьверы расчыніліся, бедны лётнік махнуў скуранай рукавіцай і схіліў галаву. Правая рука пілёта была раздроблена косьцю, куляю прабіта нага. Лётнік кіраваў левай рукой і, ня зьнімаючы нагі з педалі, дзесяткі кілёмэтраў ляцеў да аэрадрому і зьнізіўся, зрабіўшы толькі лішнія кругі...

Тут на аэрадроме пасьпелі прызвычаіцца да ўсяго нязвычайнага.

Гэтымі днямі малады лётнік, у часе разьведкі, заўважыўшы неабазначаную на карце вёску, зьнізіўся. З хат выбегалі сяляне і раптам лётнік убачыў какарды і лімпасы. Адзін рух рукі, ніхто не пасьпеў зразумець, што здарылася, як лётнік прыгожым гэстам выказаў непаразуменьне, і ўжо гудзеў прапэлер у вышыні, дзе яго не магла дагнаць куля. Вярнуўшыся з-за хмар, пілёт пайшоў у буфэт, ён піў гарбату і шчыра спачуваў афіцыянтцы:

— Як многа вам прыходзіцца бегаць, трэба ўсюды пасьпець: ад стала да кухні, усе хочуць хутчэй! Жахліва!

**
*

Камандваньне адправіла Лян Чжун-цзаю ліст, прыкладна, наступнага зьместу: супраціўленьне бескарысна, здавайцеся, разбройцеся, каб унікнуць праліцьця крыві. Усім забясьпечана безапасьнасьць.

У хуткім часе з боку Манчжуры зьявіўся белы сьцяг і сыгнал:

— Перагаворы.

Зараз-жа выехала савецкая дэлегацыя. Аўтамабіль не пасьпеў ад'ехаць ад перадавых часьцей, як раптам з-за белага сьцягу пачуліся стрэлы.

Бессансоўнае здрадніцтва ня столькі абурала, колькі зьдзіўляла. У Манчжуры зараз-жа спахваціліся і зноў замахалі белым сьцягам, але на гэты раз для давер'я ля сьцягу стаяў чужаземны консул...

Дэлегацыі спяталіся. Генэрал, як відаць, канчаткова выбыў са строю людзей, з здаровым розумам і дзейнічаў самай простай хітрасьцю. Ва ўпоўнаважанага не аказалася ніякіх поўнамоцтваў. Прадстаўнік Ляна, на сорам чужаземцаў, лавіў губамі паветра, пацісканы плячыма, расьціраў далоні, па-дзяцінаму ўхмыляўся або з несхаваным зьдзіўленьнем разглядаў крысы свайго пінджака.

— Гарнізон павінен разброіцца і здаць Манчжурыю!

Упоўнаважаны як быццам вельмі абрадаваўся, павесялеў і, паўтараючы «добра», «дасканала», пасьпяшыўся ад'ехаць.

Зноў белы сьцяг і чужаземны консул.

— Генэрал Лян Чжун-цзян гатоў здаць гарнізон на любых умовах!

— Дзьве гадзіны!

Праз дзьве гадзіны часьці Чырвонай арміі ўвайшлі ў Манчжурыю. Яшчэ на ваколіцы гораду перад усімі раскрыўся жахлівы від. Усё, што ўбачылі ў Манчжуры, здарылася за гэтыя дзьве гадзіны.

МІХ. РОЗЭНФЭЛЬД.

МЕНСК

У прэзыдыуме гарсавету

— Ліквідаваць кіраўніцтва лабудовы трамваю пастанавіў прэзыдыум гарсавету. Усе справы булуць нераданы Аўтатранспартнаму трэсту. Галоўны кіраўнік пабудовы трамваю інжынэр Кадушын ад працы вызвалены. Інжынэр Максіменка прызначаны намесьнікам дырэктара аўтатранспартнага трэсту.

**
*

Гарсавет даручыў камгасу пакінуць доктару Лунцу ў дармовае пажыцьцёвае карыстаньне належную для яго і яго сям'і жыльлёвую плошчу ў муніцыпалізаваным доме.

**
*

Менгарсавет пастанавіў ліквідаваць бюро абмену кватэр пры камгасе.

ЗА ДЗЕНЬ

— Перавыбарчая кампанія рабочай каапэрацыі. Прэзыдыум Белрабсэкцыі пастанавіў правесьці перавыбарчую кампанію па рабочай каапэрацыі БССР у пэрыяд сакавік-май 1930 году.

— Урачысты пуск фабрыкі «Пралетарская Перамога». 22-га студзеня ў Барысаве адбудзецца ўрачысты пуск новай ф-кі запалак «Пралетарская Перамога» і новай электрастанцыі пры ёй.

Зьезд хэмікаў. Усебеларускі зьезд рабочых хэмікаў склікаецца ў красавіку. Перавыбары фабзаўмясцкомаў па саюзе хэмікаў перанесены на сакавік.

Экскурсіі ў Маскву і Ленінград. Гэтымі днямі выехалі ў Маскву і Ленінград экскурсіі студэнтаў ВНУ і тэхнікумаў Беларусі. У экскурсіях прымае ўдзел каля 1.000 студэнтаў.

Пабудова новай электрастанцыі ў Менску

Прэзыдыум ВСНГ пастанавіў прыступіць да будаўніцтва новай электрастанцыі ў Менску. Станцыя будзе пабудавана на Серабранцы, на вучастку каля 101 вярсты і р. Сьвіслачы. Магутнасьць станцыі разьлічана на 12 тысяч кілёват. Пабудова станцыі будзе каштаваць 9 млн. руб. Пачнуцца будаўнічыя работы вясною гэтага году.

Званы—на трактары

23-га студзеня сяляне Самахвалавіцкага раёну, Менскай акругі, прывезьлі ў горад 6 званоў, якія зьняты, паводле пастановы агульнага сходу беднякоў і серадняцтва з Гатаўскай царквы. Званы праданы «Рудмэтальгандлю». Сродкі ад продажу званоў перераданы на ўзмацненьне трактарнай калёны «Бязбожнік».

Суд над шкоднікамі з саўгасу „Вязынь-Фаніпаль"

20 студзеня Менскі акруговы суд пачаў разглядаць справу аб шкодніцтве ў саўгасе Вязынь-Фаніпаль. Падрабязнасьці гэтай справы асьвятляліся ў газэце «Зьвязда» за № 13 ад 15 студзеня г. г. На лаўцы падсудных 9 асоб. Сярод падсудных—некалькі былых белагвардзейцаў.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЕНЬНЯ

Фракцыя Кастрычніцкага РК Мопр'у. А 7-й гадз. увеч. адбудзецца пасяджэньне фракцыі РК Мопру, на якую ў парадку партдысцыпліны павінны зьявіцца наступныя т. т.: Хмялеўскі, Камінскі, Гохман, Тоўсты, Вацкевіч, Каржуеў, Дрозд, Гаркавы, Левін, Вялічка, Саланевіч, Партная, Раманоўскі, Лейц, Адліванкіна, Гітэльман, Лельчук і Рубін.

Дом Селяніна. А 7 гадз. увеч. у залі дому Селяніна адбудзецца агульны адчынены сход ячэйкі НКЗему. Будуць абмяркоўвацца вынікі чысткі ячэйкі.

Чыстка яч. КП(б)Б Белдзяржкіно пачнецца а 2-й гадз. дня ў памяшканьні кіно «Інтэрнацыянал». Чыстку будуць праходзіць камуністыя, якія працуюць у прадпрыемствах Белдзяржкіно, працкалектыве фатографаў, у дзяржаўным і польскім перасовачных тэатрах. Для ўдзелу ў сходах чысткі запрашаюцца ўсе кіно-работнікі Менску, рабочыя працкалектыву «Паліграф», працкалектыву фатографаў і працаўнікі тэатраў.

Клюб харчавікоў. А 8 гадз. увеч. кіно. Будзе паказана «120 тысяч на год».

Клюб саўгандальслужачых. У гурткі —беларускі драматычны і харавы адкрыты дадатковы запіс у канцылярыі клюбу штодзённа ад 6 да 10 гадз. увеч.

Райпраўленьне шэф. т-ва Кастрычніцкага РК склікае на 7 гадз. увеч. інструкцыйную нараду шэфактыву ўсіх аддзяленьняў. Інструктаваць будзе старшыня Калгассаюзу т. Сьцяпанаў аб беснавой сяўбе. Прысутнасьць абавязкова.

Чыстка яч. КП(б)Б зал. «Вэлярусь» пачалася 24 студзеня. Запрашаюцца ўсе рабочыя і служачыя Белхартрэсту.

Кастрычніцкі РК Мопр'у прапануе ўсім ячэйкам Мопру безадкладна зьявіцца ў РК для атрыманьня вучотных картак і растлумачэньня парадку і спосабу пераходу на картачную сыстэму штодзённа ад 7 да 9 гадз. увеч.

ЗАЎТРА

Чыстка яч. КП(б)Б фабзавучу ст. Менск МББ чыг. пачнецца а 6 гадз. увеч. у памяшканьні школы імя Чарвякова (Савецкая, 44). Матар'ялы просьба перадаваць у праверком і РК.

АД БІРЖЫ ПРАЦЫ

Беспрацоўныя мужчыны, якія лічацца на вучоце чорнарабочай сэкцыі біржы працы, павінны прайсьці чыстку беспрацоўных у памяшканьні разумовай сэкцыі біржы працы (рог Ленінскай і Універсытэцкай вул.). Чыстка пачнецца а 7 гадз. увеч. Чорнарабочыя, якія будуць праходзіць чыстку, павінны мець наступныя дакументы: аб працоўным стажы, аб адносінах да найсковых абавязкаў і аб сацыяльна-матар'яльным становішчы. Чорнарабочыя павінны зьяўляцца ў наступным парадку: 25 студзеня асобы, прозьвішчы якіх пачынаюцца на літары В, Г, 26— Д, Е, Ж, З, І; 27—К; 28—Л, М; 30—Н, О, П; 31—Р, С; 1 лютага—Т, У, Ф, Х, Ц, Ч; 2 лютага—Ш, Э, Ю, Я.. З лютага—усе, хто спозьніцца. Хто ня зьявіцца на чыстку біз уважлівых прычын, будзе зьняты з вучоту.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

ЗДАВАЙЦЕ ПАДПІСКУ на ЛЮТЫ і дальейшыя месацы 1930 году
на старэйшую ў БССР вялікую штодзённую газэту
„ЗЬВЯЗДА"
ЦЭНТРАЛЬНЫ ОРГАН КП(б)Б. XIV ГОД ВЫДАНЬНЯ.

УСЕ ПАДПІСЧЫКІ „ЗЬВЯЗДЫ" на 1930 год ДАРМОВА АТРЫМАЮЦЬ ДАДАТАК
газэту на 4-х стар. орган ЦСПСБ „ПРАФРУХ Беларусі" газэту на 4-х стар. орган ЦСПСБ
(замест праф. часопісі пад тай-жа назвай, якая з студзеня 1930 г. ня будзе выходзіць)
ПАДПІСНАЯ ЦАНА на „ЗЬВЯЗДУ" з дадаткам „ПРАФРУХ" застаецца ранейшая: на год—9 руб. 75 кап., на 6 м.—5 руб., на 3 м.—2 р. 60 к., на 1 м.—90 кап.

„ЗЬВЯЗДА" дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льгэтных умовах наступныя часопісі:
НОВУЮ 2-х тыднёвую партыйную часопісь (орган ЦК КП(б)Б) ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК „Парт. Работнік" будзе выходзіць замест часоп. „Вестн. ЦК КП(б)Б" і „У дапамогу партвучобе".
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на 1 месяц—20 кап. (замест 25 кап.)

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на 1 м.—20 к. (замест 35 к.)

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ
Падпісная цана: на год—1 руб. замест звычайнай цаны 3 руб.; на 6 мес.—75 кап., на 3 мес.—50 кап.

ОГОНЕК
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на «ЗЬВЯЗДУ» з часопісьсю «ОГОНЕК» на 1 м.—1 р. 10 к

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: галоўнай канторай «ЗЬВЯЗДЫ» (Менск, Савецкая, 63), усімі паштовымі канторамі, лістаносцамі і спэцыяльнымі ўпоўнаважанымі.

Ц. ГНІК НАНКІН—СУ-ЧЖОУ

Галубы Экспрэс
МІЖНАРОДНЫМ ВАГОНЕ ТРЫВОГА!
Спазьненьня ў пуці няма

СЫН ПАЎДНЁВЫХ МАРЭЙ
МОАНА
Paramount-Film

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва.
ЛІТАРАТУРА
ДА МЕСЯЧНІКА ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ.
ВЫШЛІ З ДРУКУ:

1. Журыя.—Як выгадаваць добрых парасят. 1928 г. Цана 20 кап.
2. Паўлаў.—Як гадаваць сьвіней. 1929 г. Цана 20 кап.
3. Бойко.—Як гадаваць ялё. 1929 г. Ц. 10 к.
4. Івашова.—Сьвівыня—скарбонка гаспадыні. 1929 г. Цана 7 кап.
5. Грышкевіч.—Трымай свойскую птушку. 1929 г. Цана 10 кап.
6. Серада.—Заразьлівыя хваробы сьвіней. 1929 г. Цана 20 кап.
7. Манарэўскі.—Кароста ў свойскай жывёлы. 1929 г. Цана 20 кап.
8. Жарын.—Сібірка. 1929 г. Цана 10 кап.
9. Серпаў.—Матылёк. 1929 г. Цана 8 к.
10. Белцар.—Сухоты свойскай жывёлы. 1928 г. Цана 8 кап.
11. Мансьветаў.—На што хварэюць куры. 1928 г. Цана 5 кап.
12. Седашоў.—Пасьба скацінны ў лесе. 1929 г. Цана 15 кап.
13. Журын.—Як сілаваць кармы. 1929 г. Цана 7 кап.

Рыхтуюцца і хутка выйдуць з друку:

1. Пелехаў.—Што трэба ведаць пра гадоўлю жывёлы.
2. Казэнцаў.—Утрыманьне плямянога быка.
3. Кулінаў і Ухін.—Колькі трэба корму для каровы на год.
4. Месьленьнінаў.—Што трэба ведаць пра даеньне каровы.
5. Лісцун.—Выгады правільнага догляду і кармленьня малочнай скацінны.
6. Азярэў.—Цельнасьць і ацел.
7. Маньковіч.—Пабудова скотнага двара ў калгасе.
8. Журын.—Як выгадаваць добрых парасят. II выданьне
9. Журын.—Пытаньні бэконізацыі ў БССР.
10. Старынкі.—Як дагадаць каня.
11. Серада.—Пабудова сілосаў у калгасах і саўгасах.

Прадаецца ва ўсіх кнігарнях і аддзяленьнях Белдзяржвыдавецтва, кіёсках і крамах спажывецкай каапэрацыі.

РАСПАЧАТА ПАДПІСКА НА 1930 г.
Вы ўжо спазьніліся падпісацца на пэдагогічную часопісь
„АСЬВЕТА"
Замест «АСЬВЕТЫ» будзе выдавацца масавая пэдагагічная і палітычна-асьветная часопісь
КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ

Часопісь «КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ» вядзе ваўнічую барацьбу за камуністычнае выхаваньне працоўных мас, жыва адклікаецца на ўсе палітычныя, пэдаэга-пэдагагічныя, палітасьветныя праблемы дня.

Часопісь «КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ» зьявіцца лепшым памочнікам у рабоце настаўніка, палітасьветніка, дашкольніцы.

Часопісь «КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ» будзе выходзіць пры ўдзеле лепшых марксыцкіх сіл як Беларусі, так і інш. Саюзных Рэспублік.

Умовы падпіскі на 1930 год.

На 1 год (12 нумароў)	8 руб.
» паўгода (6 нумароў)	4 руб. 50 кап.
» 3 м-цы (3 нумары)	2 руб. 30 кап.
Кошт асобнага нумару	— 80 кап.

Скідка 25% паводле агалошанай цаны дасцца настаўнікам школ, хатнікам і інш., якія выпісваюць часопісь за свой кошт на цалы год. Раённым установам (Райвыканкам, мясцком) скідка 25% у тым выпадку, калі яны падпішуцца ня менш, як на 50 экзэмпляраў на цэлый год.

Падпіска прымаецца рэдакцыяй: Менск, Пляц Волі, 23|2, а таксама поштай і аддзяленьнямі Белдзяржвыдавецтва.

Усе, хто падпісаўся на часопісь „Асьвета" на 1930 год, будуць атрымліваць без асобнай даплаты—часопісь „Камуністычнае выхаваньне"
Сьпяшайцеся з падпіскай на часопісь «КАМУНІСТЫЧНАЕВЫХАВАНЬНЕ»

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР
Э. ТОЛЬЛЕР.
СУБОТА, 25 студзеня.
Дом Камсамолу наладжвае паход у тэатр.
Білеты ў Доме Камсамолу.
ГОП-ЛЯ, ЖЫВЁМ
Пачатак а 8 гадз. 30 м.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
Гістарычны мастацкі фільм
ДАРОГА ў СЬВЕТ
Звыш праграмы кіно-хроніка Сазкіно № 1.
Пачатак роўна а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

КІНО Пэрвацыянал
Гістарычны фільм з пралёгам
ДОМ на ВУЛКАНЕ
Звыш праграмы культурфільм
ВЫТВОРЧАСЬЦЬ АЛОЎКАЎ.
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

КІНО Пралетары
Новы совецкі фільм вытворч. Арменкіно
16-ты (Шаснаццаты)
Звыш праграмы За сацыялістычную вёску
ЧАСОПІСЬ САЗКІНО № 2.
Пачатак 1-га сэансу—а 7 г. Каса—ад 5 гадз.

КІНО Спартак
2 праграмы 2 у адзін сэанс: драма ў 6 част.
1) НАРАДЗІЎСЯ ЧАЛАВЕК
У гал. ролі народны артыст рэспублікі МАСКВІН.
2) Весёлая амэрыканск. камэдыя ЦЁМНЫ КАНЁК.
Сёньня пачатак 1 сэан. а 6 гадз. 30 м.
Каса адкрыта ад 5 гадз.

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР."
Толькі 3 дні
Мастацкі бытавы фільм
24, 25 і 26 студзеня
НЕЧАКАНЫ ГЭРОЙ
у 6 частках.
Штодзённа 2 сэансы: пачатак 1-га сэансу а 2 гадз. дня, 2-га—а 3 гадз. 30 м.
Каса адкрыта ад 12 гадз. дня.

БЮРО ПАДПІСКІ
„КНІГА-ПОШТАЙ"
Белдзяржвыдавецтва
ПЕРАМЯСЬЦІЛАСЯ
на ЛЕНІНСКУЮ вул. № 19
(уваход са двара)
Падпіску на ўсе беларускія часопісі („Полымя", „Чырвоная Беларусь" і інш.) просьба здаваць па гэтым адрасе.
— ТЭЛЕФОН 17-12 —

На падставе пастановы прэзыдыуму Менгарсавету ад 19-1—30 г. (пратакол № 36, п. 800)
КІРАЎНІЦТВА ПАБУДОВЫ ТРАМВАЮ
ЛІКВІДУЕЦЦА
і баланс кіраўніцтва пабудовы трамваю па актыву і пасыву ПЕРАДАЕЦЦА
транспартнаму трэсту Менакрвыканкому,
да якога і належыць зварочвацца з прэтэнзіямі у працягу 1 мес.
Пасьля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі ПРЫМАЦЦА НЯ БУДУЦЬ.

ГАЛОЎНЫ БУХГАЛЬТАР
са стажам вытворчай бухгальтэрыі і эканамістага ШУКАЕ ПРАЦЫ. Прапановы накіроўваць: Менск, Ракаўская, 5, кв. 6. П. Ф. Вольскаму.

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА"
звяраецца па тэл. 7-81

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ ВЫШЛІ З ДРУКУ:

1. ЛАЙКОЎ.—Як выкарыстаць адкіды гаспадаркі і а ўгнаеньне. 1929 г. Цана 20 к.
2. П. ТРУС.—Пытаньні ўгнаеньня ў беларускіх умовах. 1929 г. Ц. 1 р. 65 к.
3. ТУПЯНЕВІЧ—Вялікі ўраджай праз мінэральныя ўгнаеньні. 1929 г. Цана 10 к.
4. Г. ЧУЙКО.—Вынікі сялянскіх досьледаў з мінэральнымі ўгнаеньнямі. 1929 г. Цана 60 к.
5. М. САВІЦКІ і П. ТРУС.—Вапнаваньне глебы. 1929 г. Цана 05 к.
6. В. КАЧАТКОЎ.—Хэмія на службе сялянину. 1929 г. Цана 15 к.
7. БАХЦЕЯЎ І САВІЦКІ.—Попел, як угнаеньне. 1929 г. Цана 10 к.
8. Е. АЛЯКСЕЕЎ.—Лубінавае ўгнаеньне на Беларусі. Цана 30 к.
9. Г. МІНЦ.—Зялёныя фабрыкі. 1929 г. Цана 15 к.
10. Д. ПРАКАПЕНКА.—Канюшына. 1929 г. Цана 15 к.
11. Ю. РЭГО.—Ці можа перад'ідзіца збожжа. 1929 г. Цана 08 к.
12. В. ЧЭМЕЛАЎ.—Гадоўля цыбулі. 1929 г. Цана 20 к.
13. ДРАЗДОЎ.—Як павялічыць ураджайнасьць нашага поля. Цана 06 к.
14. К. РЭНАРД.—Як разводзіць коранеплоды. 1929 г. Цана 20 к.
15. А. ДЗЯМІДОВІЧ.—Бульба. 1929 г. Цана 28 к.
16. ПРОХАР І У.—Культура кармовых коранеплодаў. 1929 г. Цана 20 к.
17. Ь. ЧЭМЕЛАЎ.—Як гадаваць насеньне коранеплодаў. 1929 г. Цана 10 к.
18. ПАРФІЯНОВІЧ.—Самі вырасьлізайце гародняе насеньне 1929 г. Цана 10 к.
19. БЕСЕМІРСКІ.—Культура табакі. 1929 г. Цана 15 к.
20. БУРШТЭЙН.—Асновы пладоўніцтва Беларусі. 1929 г. Цана 55 к.
21. КАУР.—Пасадка і догляд саду. 1929 г. Цена 10 к.
22. ЯКАЎЛЕЎ.—Барацьба за ўраджай. 1929 г. Цана 30 к.
23. ВІЛЬЯМС.—Праблема ўраджайнасьці. 1929 г. Цана 12 к.
24. М. УЛІЦІН.—За ўраджай. 1929 г. Цана 65 к.
25. ЛАЙКОЎ.—Шматпольныя севазвароты. 1929 г. Цана 20 к.
26. ТУПЯНЕВІЧ.—Выраб глебы па новаму. 1929 г. Цана 12 к.
27. М. САВІЦКІ.—Галоўныя вынікі работы раённых с.-г. дасьледчых станцый. 1929 г. Цана 40 к.
28. П. ЗАЯЦ.—Ачышчэньне зерня. 1929 г. Цана 10 к.
29. Х. БАХЦЕЕЎ.—Як прапаваць на асушаным балоце. 1929 г. Цана 18 к.
30. Х. БАХЦЕЕЎ.—Як здабываць торф. 1929 г. Цана 20 к.
31. КОБАЗАЎ.—Скарыстаньне торфу ў сельскай гаспадарцы. 1929 г. Цана 28 к.
32. САУКІН.—Кароткі запаможнік па асушцы балот. 1929 г. Цана 38 к.
33. ІВАНОЎ.—Як змагацца з пяскамі. 1929 г. Цана 15 к.
34. БЕХЦЕЕЎ.—Як палепшыць сенажаці і выганы. 1929 г. Цана 20 к.
35. ТУПЯНЕВІЧ.—Грыбныя хваробы расьлін. 1929 г. Цана 20 к.
36. ПІЛЬКО.—Шкоднікі зерня і змаганьне з імі. 1929 г. Цана 03 к.
37. ПІЛЬКО.—Галоўныя шкоднікі поля. 1929 г. Цана 10 к.
38. Г. МАСЛАКАВЕЦ.—Надворе і ўраджай. 1929 г. Цана 80 к.

Рыхтуюцца і хутка выйдуць з друку:

1. ЛАБАДАЕЎ.—Бальшавіцкім тэмпам. (Задачы КСМ у веснавую с.-г. кампанію)
2. КУДЗІНАЎ.—Калгасы і веснавая сельска-гаспадарчая кампанія.
3. ЗАЯЦ.—Задачы веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі.
4. ЗАЯЦ.—Што трэба ведаць рабочаму аб веснавой сяўбе.
5. ПАЎЛАЎ.—Барацьба са шкоднікамі ў веснавую сяўбу.
6. КАНАВАЛЬЧЫК.—Жанчына-дэлегатка і веснавая сяўба.
7. ЖВАНСКІ.—Скарыстайце вынікі працы дасьледчых устаноў.
8. ХАБЭНКА.—Арганізацыя буйных прамысловых гарадоў.
9. РЫБАКОЎ.—Сельска-гаспадарчая каапэрацыя і веснавая сяўба.
10. ЛЭВІТ.—Кантрактацыя.
11. ЗАЯЦ.—Ачыстка насеньня, II выд.
12. ТАЎКАЧОЎ.—Якасьць насеньня і яго выяўленьне да сяўбы.

Прадаюцца ва ўсіх кнігарнях і аддзяленьнях БДВ, кіёсках, крамах спажыўкаапэрацыі.

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты ад 2 гадзіны дня

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск. Менск, Галоўлітбел № 337.